Хакейныя навіны — вачыма нашага карэспандэнта

СТАР.3

Здзіўляе... лялечны тэатр

СТАР.4

Як апранацца «аб'ёмным» жанчынам?

СТАР.7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 МАЯ 2014 г. СУБОТА № 90 (27700) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ З МІТРАПАЛІТАМ ФІЛАРЭТАМ

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з мітрапалітам Філарэтам, пачэсным Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы і мітрапаліт Філарэт запалілі свечкі ў дамавым храме ў гонар Сабора Беларускіх святых, цёпла паразмаўлялі і абмяняліся падарункамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вагоне мінскага метро.

МУЗЫЧНЫ ЭКСПРЭС

ЛІЧБА ДНЯ

$566

у эквіваленце склала сярэднямесячная заработная плата ў студзені—сакавіку. Беларусь у першым квартале гэтага года лідзіравала сярод краін Мытнага саюза па росце заработнай платы. Такая выснова вынікае з даных, прадастаўленых прэс-службай Еўразійскай эканамічнай камісіі. У студзені—сакавіку ва ўсіх дзяржавах — членах МС назіраўся рост намінальнай і рэальнай налічанай заработнай платы. У параўнанні з першым кварталам 2013-га намінальная сярэдняя заработная плата ў Беларусі вырасла на 21,2%, у Казахстане — на 7,5%, у Расіі — на 10,9%. Тэмп росту рэальнай заработнай платы (з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у першым квартале ў Беларусі склаў 104,9%, Казахстане — 101,9%, Расіі — 104,2% .

■ Актуаліі

«СПІСАННЯ ДАЎГОЎ НЕ БУДЗЕ — У ЛЕПШЫМ ВЫПАДКУ РЭСТРУКТУРЫЗАЦЫЯ»

«Хранічна стратныя арганізацыі аграпрамысловага комплексу краіны чакае радыкальная рэарганізацыя», — заявіў учора на нарадзе ў Круглянскім раёне па праблемных пытаннях развіцця АПК Магілёўскай вобласці прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. Учора ж прэм'ер правёў аналагічную нараду на Віцебшчыне, у Талачынскім райвыканкаме, а напярэдадні аналагічнае мерапрыемства прайшло ў Лідзе.

Міхаіл Мясніковіч патлумачыў свой асабісты ўдзел у лідскай нарадзе ў, здавалася б, паспяховай у сельскагаспадарчай галіне вобласці, наступнымі прычынамі. Па выніках працы аграрнай галіны летась па прыбытку на 1 бала-гектар сельгасугоддзяў Гродзеншчына знаходзіцца на першым месцы ў краіне. Але разам з тым 64 сельгаспрадпрыемствы (42%) спрацавалі з рэнтабельнасцю менш за 5%. Гэта фактычна ўжо на мяжы плацежаздольнасці. А 32 арганізацыі наогул атрымалі страты ад рэалізацыі прадукцыі. Працягваецца нарошчванне даўгоў, рост фінансавых абавязацельстваў аграрнікаў вобласці перавышае сярэднерэспубліканскі ўзровень. У асобных гаспадарках на 1 рубель выручкі прыпадае 3 і больш рублёў запазычанасці.

— Чаму пры някепскіх у цэлым паказчыках так шмат прадпрыемстваў, якія працуюць значна ніжэй за свае магчымасці? Наколькі эфектыўная работа аблвыканкама, раённых уладаў? Як яны ўплываюць на становішча спраў? Ведаеце, ёсць такое паняцце, як куратарства. Я паглядзеў у тлумачальным слоўніку: гэта азначае «назіраць за дзейнасцю». Мне ўяўляецца, што многія выканкамы Гродзенскай вобласці і, напэўна, не толькі яе, замест прыняцця канкрэтных кіраўніцкіх рашэнняў, у тым ліку ў кадравай палітыцы, займаюцца назіраннем. Таму першая задача — неабходна ў корані змяніць работу з кадрамі, — лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Другая група пытанняў — гэта граматнае выкананне неабходных тэхналогій. Летась у вобласці недаатрымалі да ўзроўню 2012 года сельскагаспадарчай прадукцыі больш чым на 800 мільярдаў рублёў.

— Гэта пастаяннае ныццё, што грошай няма... Але адкуль грошы будуць, калі не прытрымліваешся тэхналогій, таго, што рэкамендуюць практыкі і вучоныя? Калі б строга выконваліся ўсе тэхналагічныя патрабаванні, то, паводле экспертнай ацэнкі, маглі атрымаць у вобласці прадукцыі больш на 2 трыльёны рублёў, — зазначыў кіраўнік урада.

Шмат прыкладаў, калі гаспадаркі знаходзяцца ў роўных прыродна-кліматычных і эканамічных умовах, але паказчыкі эфектыўнасці работы зусім розныя. На нарадзе былі названы разлікі па кожнай з галін аграрнай сферы, прычым зыходзячы не з вынікаў лідараў, а з сярэднеабласных паказчыкаў. Калі б усе гаспадаркі выйшлі на сярэдні ўзровень, то вобласць атрымала б дадаткова прадукцыі на дзясяткі мільярдаў рублёў. Нявыкарыстаныя рэзервы — у недапушчэнні элементарнай бесгаспадарчасці, дакладным выкананні нарматываў і тэхналагічных рэгламентаў.

СТАР.2

■ Трэба ведаць

ЦЯПЕР ПА-НОВАМУ

будуць гандляваць індывідуальныя прадпрымальнікі

Для індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку ў Беларусі з 1 ліпеня 2014 года ўстанаўліваецца абавязак мець у наяўнасці на ўсе тавары, што рэалізуюцца, у тым ліку і на ўвазныя з краін Мытнага саюза, дакументы, якія пацвярджаюць набыццё (паступленне) гэтых тавараў. Адпаведны ўказ № 222 «Аб рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці і рэалізацыі тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі» Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 мая, паведаміла БЕЛТА.

Для індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку да 1 сакавіка 2015 года ўстаноўлены пераходны перыяд, на працягу якога ім даецца права рэалізаваць рэшткі тавараў, увезеных у Беларусь з тэрыторыі краін Мытнага саюза да 1 ліпеня 2014 года без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё (паступленне).

У гэтых мэтах індывідуальныя прадпрымальнікі па стане на 1 ліпеня 2014 г. складаюць вопіс рэшткаў такіх тавараў па кожным гандлёвым і складскім аб'екце, які ў тэрмін да 30 ліпеня 2014 года рэгіструюць у падатковым органе. У далейшым зарэгістраваныя вопісы захоўваюцца на гандлёвых аб'ектах да поўнай рэалізацыі рэшткаў тавараў.

Пакольк і ў адпаведнасці з указам рэалізацыя рэшткаў тавараў з выплатай падатку на дабаўленую вартасць у фіксаваных сумах будзе ажыццяўляцца да 1 сакавіка 2015 года, то з 1 сакавіка 2015 года з Указа Прэзідэнта ад 18 чэрвеня 2005 года № 285 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці» выключаецца прадпісанне аб магчымасці выплаты падатку на дабаўленую вартасць у фіксаваных сумах у дачыненні да тавараў, увезеных індывідуальнымі прадпрымальнікамі — плацельшчыкамі адзінага падатку з краін Мытнага саюза без таварасуправаджальных дакументаў.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія будуць мець дакументы на ўсе тавары, што рэалізуюцца, у адпаведнасці з указам будуць мець права перайсці на спрошчаную сістэму падаткаабкладання альбо з 1 ліпеня, альбо з 1 кастрычніка 2014 года.

Акрамя таго, указам прадугледжаны канкрэтны пералік тавараў, рэалізацыя якіх будзе ажыццяўляцца фізічнымі асобамі без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё.

За рэалізацыю тавараў, не ўказаных у пераліку, для фізічных асоб прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

Адначасова з увядзеннем для індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку абавязку па наяўнасці пацвярджальных дакументаў на тавары, якія імі рэалізуюцца, індывідуальным прадпрымальнікам даецца права прыцягваць да прадпрымальніцкай дзейнасці не больш за тры наёмныя асобы, незалежна ад роднасных сувязяў.

Таксама здымаюцца абмежаванні па колькасці гандлёвых, абслуговых і іншых аб'ектаў, якія выкарыстоўваюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў сваёй дзейнасці.

Фота Пятра ФАМІНА.

ПАД КАНТРОЛЕМ ДЗЯРЖКАМІСІІ

пройдуць уступныя іспыты

Дзяржкамісія па кантролі за падрыхтоўкай і правядзеннем уступных іспытаў у ВНУ і ССНУ ў 2014 годзе створана ў Беларусі. Адпаведны ўказ № 223 «Аб арганізацыі ўступнай кампаніі ва ўстановах адукацыі ў 2014 годзе» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 мая, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Указам створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2014 годзе. У склад камісіі ўключаны члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і работнікі кантралюючых органаў», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Камісія прызначана забяспечваць кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання, іншых форм уступных іспытаў, прадастаўленнем абітурыентам роўных магчымасцяў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прымаць меры па ўстараненні выяўленых парушэнняў нарматыўных прававых актаў, што рэгулююць арганізацыю і правядзенне прыёму, ажыццяўляць прыём грамадзян па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў, а таксама забяспечваць асвятленне работы камісіі ў сродках масавай інфармацыі.

«Гэты ўказ забяспечыць выкананне заканадаўства пры падрыхтоўцы і правядзенні ўступных іспытаў і залічэнні абітурыентаў ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі», — адзначылі ў прэс-службе.

■ Факт

Стаўка рэфінансавання з панядзелка стане 21,5% гадавых

З 19 мая стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка зніжаецца на 1 працэнтны пункт і ўстанаўліваецца на ўзроўні 21,5 працэнта гадавых. Адпаведнае рашэнне прынята Праўленнем Нацыянальнага банка, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе галоўнага банка краіны.

Спецыялісты Нацбанка патлумачылі нам, што гэтая мера дасць магчымасць павысіць даступнасць крэдытаў пры адначасовым захаванні высокага ўзроўню даходнасці па рублёвых дэпазітах, які перавышае даходнасць дэпазітаў у замежнай валюце.

Нацыянальны банк у маі працягнуў паступовае зніжэнне працэнтных ставак у эканоміцы, якія знаходзяцца на значным станоўчым узроўні ў рэальным вымярэнні. Пры гэтым у цэлым падыходы да правядзення грашова-крэдытнай палітыкі застаюцца досыць жорсткімі, бо яны спрыяюць падтрыманню макраэканамічнай збалансаванасці, удакладнілі сваю пазіцыю эксперты Нацбанка.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛАТВІЙСКІХ ПАЛЯЎНІЧЫХ ХОЧУЦЬ ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АБАРОНЫ ДЗЯРЖАВЫ

Міністэрства абароны Латвіі прапанавала ацаніць магчымасці мясцовых паляўнічых на выпадак, калі ўзнікне неабходнасць прыцягнуць іх да абароны дзяржавы ад ворага. Такі запыт ведамства накіравала кіраўніцтву Земессардзе (добраахвотнае ваенізаванае фарміраванне, якое ўваходзіць у структуру латвійскіх узброеных сіл), паведамляе DELFI. У Латвіі сёння афіцыйна зарэгістравана больш за 26 тысяч паляўнічых (з іх у Земессардзе ўступіла толькі 615), у якіх на руках знаходзіцца каля 53 тысяч адзінак стралковай зброі. Між тым кіраўнік Латвійскай асацыяцыі паляўнічых Харалд Барвікс адзначыў, што яго падапечных складана лічыць «паўнавартаснай абароннай сілай», паколькі іх сярэдні ўзрост складае 54 гады.

АДБЫЛАСЯ ДРУГАЯ ЗА ГОД АВАРЫЯ «ПРАТОН-М»

Запушчаны ўчора ў 1.42 па маскоўскім часе з касмадрома Байканур «Пратон-М» не змог вывесці на арбіту самы магутны расійскі апарат сувязі «Экспрэс-АМ4Р», кошт якога перавышае 150 млн еўра. Як мяркуецца, абломкі ўпалі ў Ціхі акіян. Паводле апошніх звестак, на вышыні 161 км на 545-й секундзе палёту адбылася адмова рухавіка трэцяй ступені ракеты-носьбіта з-за адхілення «Пратона-М» ад траекторыі палёту. Папярэдняя буйная аварыя ракеты-носьбіта «Пратон-М» адбылася 2 ліпеня 2013 года.

НЕБЫВАЛАЯ ПАВОДКА Ў СЕРБІІ. ЁСЦЬ АХВЯРЫ

Рэжым надзвычайнай сітуацыі абвешчаны на ўсёй тэрыторыі краіны. Прычынай сталі наймацнейшыя праліўныя дажджы, з-за якіх рэкі выйшлі з берагоў. Вядзецца эвакуацыя з пацярпелых раёнаў, ёсць чалавечыя ахвяры. Паводле звестак метэаролагаў, такія ападкі адзначаюцца ўпершыню за 120-гадовую гісторыю. У сталіцы краіны Бялградзе за 40 гадзін выпала двухмесячная норма ападкаў. Пры гэтым ліўні не спыняюцца. Урад Сербіі ўжо звярнуўся па гуманітарную дапамогу да Расіі, Славеніі і Еўрасаюза. Маецца дакладная інфармацыя аб двух загінулых, яшчэ двое лічацца прапаўшымі без вестак. Эвакуявана больш за 4.000 чалавек. Дзясяткі тысяч людзей у розных раёнах застаюцца без электрычнасці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЧАСТАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭЛЕФОНА ЎСЁ Ж ТАКІ ВЫКЛІКАЕ РАК



Калі чалавек карыстаецца мабільным тэлефонам больш за 30 хвілін у дзень на працягу пяці гадоў, то рызыка развіцця раку мозгу ў яго павышаецца ў тры разы. Гэта выснова французскіх экспертаў Універсітэта Бардо. Як паказала іх даследаванне, людзі, якія выкарыстоўвалі тэлефон па 15 гадзін за месяц, у 2-3 разы часцей сутыкаліся з гліёмай або менінгіёмай, піша Times Live.

Варта адзначыць, пра небяспеку тэлефонаў навукоўцы кажуць даўно. Аднак даказаць наяўнасць прамой прычынна-следчай сувязі ім так і не ўдалося. На гэты раз, даследчыкі наблізіліся ўшчыльную да гэтага. Яны прааналізавалі 253 выпадкі гліёмы і 194 выпадкі менінгіёмы, зафіксаваныя ў 2004-2006 гадах. Параўноўваліся ракавыя пацыенты з 892 здаровымі людзьмі з кантрольнай групы. Аказалася, рызыка развіцця раку сапраўды павышана сярод людзей, якія актыўна карыстаюцца тэлефонамі. У ходзе работы былі выяўлены невытлумачальныя анамаліі. У адрозненне ад папярэдніх даследаванняў, навукоўцы высветлілі: рак развіваўся ў частцы мозга, процілеглай той, да якой звычайна тэлефон размяшчаўся максімальна блізка.

КАРОТКА

Да 2019 года на Заходняй Дзвіне сумесна з кітайскай кампаніяй пабудуюць Віцебскую ГЭС. Гэта прадугледжана ўказам № 219 «Аб будаўніцтве Віцебскай ГЭС на рацэ Заходняя Дзвіна», які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 мая.

Акцыя па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні тэрыторый «Саюзнае прыбіранне» пройдзе 5 чэрвеня на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Казахстана.

Свята нацыянальнай культуры «Свята Бульбаша» 18 мая запрашае гасцей ЧС-2014 па хакеі пакаштаваць прысмакі беларускай кухні ў гарналыжным цэнтры «Сілічы».

У праграме «Ночы ў Лідскім замку» 17 мая гасцям Лідскага музея можна будзе прымераць даспехі падчас пасвячэння ў рыцары. А таксама ўбачыць «Майстэрню Містра» — пакой катаванняў і пакаранняў.

Кампанія МТС з 26 мая павялічыць кошт некаторых паслуг сувязі. Расходы абанентаў у сярэднім павялічацца на 8%.

■ Рэха «Еўрабачання»

УЗНАГАРОДА З ПРЫСМАКАМ ЧЫЗКЕЙКА

Прадстаўнік Беларусі на міжнародным музычным форуме «Еўрабачанне-2014» Юрый Вашчук, ён жа спявак Тэа, узнагароджаны ганаровай граматай Міністэрства культуры. З паспяховым вынікам артыста павіншаваў міністр культуры Барыс Святлоў на неафіцыйнай сустрэчы *(на фота)*. Не абышлося і без дэгустацыі папулярнага апошнім часам чызкейка.

Фота БЕЛТА.

— Зразумела, што мае асабістыя ўражанні пра артыста і яго ўзровень склаліся задоўга да фіналу. Усё, пачынаючы з адборачнага тура, працякала на маіх вачах, і ўжо тады я складваў нейкі асабісты рэйтынг, дзе Юра быў на першым месцы. Калі мае прагнозы супалі з тым, як ацанілі яго прафесіяналы, то я быў спакойны адносна таго, што наш прадстаўнік на конкурсе пакажа высокі ўзровень і зможа прэтэндаваць на належную ацэнку, — адзначыў Барыс Святлоў. — «Еўрабачанне» ад слова «бачыць», таму там, магчыма, не так важна паказваць узровень выканаўчага майстэрства, як стварацца карцінку, нейкі эпатаж, бо гэта выклікае павышаны інтарэс у гледача. Таму, лічу, першае месца на сёлетнім конкурсе было прадказальным. Але я парадаваўся за наша 5-е месца ў паўфінале і за вынік у фінале. Наш артыст, на мой погляд, вылучаўся сваім прафесіяналізмам.

СТАР.3

«СПІСАННЯ ДАЎГОЎ НЕ БУДЗЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вельмі вострая праблема — эфектыўная работа малочнатаварных комплексаў, што будуюцца па дзяржаўнай праграме. Рэаліі такія, што многія гаспадаркі апынуліся ў сапраўднай даўгавой «яме», практычна не маючы рэальных шанцаў разлічыцца па крэдытах. А гэта не дазваляе забяспечваць комплексы належным статкам, кармамі і, адпаведна, атрымліваць аддачу ад фінансавых сродкаў у сучасныя тэхналогіі. У сувязі з гэтым, у прыватнасці, абласныя ўлады лічаць неабходным зменшыць працэнтныя стаўкі па крэдытах — не толькі новых, але і па раней атрыманых на будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў АПК (маржа павінна складаць не больш за 3%). Акрамя таго, пры будаўніцтве малочнатаварных комплексаў выплачваць асноўны доўг па банкаўскіх крэдытах праз тры гады, што звязана з тэхналогіяй вытворчасці буйной рагатай жывёлы і атрымання выручкі ад яго рэалізацыі, працэнты банкаў — праз год пасля ўводу аб'екта.

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што першачарговая задача цяпер — нарыхтаваць якасныя кармы, без чаго немагчыма эфектыўная вытворчасць малака. Летась увогуле на Гродзеншчыне на адну ўмоўную галаву жывёлы нарыхтавалі кармоў больш, чым у сярэднім па рэспубліцы, але іх якасць далёка не заўсёды адпавядала патрабаванням.

Паводле даследаванняў Белдзяржветцэнтра, вялікія аб'ёмы сенажу і сіласу (адпаведна 21,9 і 25,3%) аказаліся непрыдатнымі для скармлівання жывёле па ўтрыманні масленай кіслаты. Недапушчальна, каб сёлета гэта паўтарылася.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Май на ўвазе!

МЫТНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ ЦЯПЕР І ПА КАРТЦЫ

Беларусбанк устанаўлівае спецыяльныя тэрміналы самаабслугоўвання, прызначаныя для правядзення аплаты мытных плацяжоў з выкарыстаннем банкаўскіх картак, паведамілі карэспандэнту газеты ў прэс-службе банка.

Такія прылады дазваляюць кліентам самастойна аплачваць мытныя плацяжы і пры гэтым не звяртацца да паслуг касіраў. Падобная паслуга не толькі пашырае магчымасці трымальнікаў картак, але і памяншае час праходжання працэдуры аплаты плацяжоў. Эксперты банкаўскай сферы адзначаюць той факт, што ажыццяўленне падобнага плацяжу мае даволі просты алгарытм.

Спачатку ўводзіцца нумар плацежнага дакумента, пасля чаго прылада па спецыяльнай электроннай базе мытных плацяжоў правярае яго на дакладнасць, далей робіцца аплата, пацвярджэннем якой з'яўляецца атрыманы кліентам чэк. Цяпер такімі тэрміналамі абсталяваны пункты мытнага афармлення, размешчаныя ў Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ АПК: праблемы і рашэнні

ПА БЕЗГАСПАДАРЧАСЦІ — І ПЕРНІКАМ, І БІЗУНОМ

Як зрабіць работу аграпрамысловага комплексу эфектыўнай

Рабочая нарада па пытаннях развіцця аграпрамысловага комплексу Мінскай вобласці адбылася ў Сеніцы.

Фота БЕЛТА.

У аграпрамысловым комплексе зроблена нямала. Але многія пытанні патрабуюць аператыўнага рэагавання. Перш за ўсё — захоўванне тэхнічных і тэхналагічных рэгламентаў, нарматываў расходаў, затрат, працоўнай дысцыпліны. Міжгаліновая рабочая група прапануе розныя меры адказнасці за невыкананне тэхнічных рэгламентаў і нарматываў, безгаспадарчасць. Першая — адміністрацыйная, якая цягне за сабой звальненне з работы без права ў далейшым займаць кіруючыя пасады. «Трэба перастаць бегаць з месца на месца: тут не атрымалася — перабег у іншую гаспадарку», — заўважыў **віцэ-прэм'ер Міхаіл РУСЫ (на фота)**. Кіраўнікам можа пагражаць і крымінальная адказнасць. «Гэта павінны разумець усе: ад кіраўніка да механізатара. Асаблівая размова пра тых, хто прыйдзе на работу ў нецвярозым стане», — падкрэсліў ён.

Віцэ-прэм'ер нагадаў, што з 1 студзеня ўступіў у дзеянне новы механізм налічэння заработнай платы. У кіраўнікоў, спецыялістаў з'явіўся стымул да добрай працы. Тыя, хто дасягнуў значных паказчыкаў, могуць зарабіць і 30 млн рублёў.

Трэба даць уздыхнуць сельгаспрадпрыемствам, крэдытныя рэсурсы пры цяперашняй стаўцы кладуцца на іх плечы цяжкай ношай

Ёсць пытанні да многіх прадпрыемстваў і па фінансавай запазычанасці. Скажам, калі выручка складае 70 трлн рублёў, то фінансавыя абавязацельствы — 80 трлн рублёў. Бясспрэчна, тут ёсць і доўгатэрміновыя крэдыты, якія выдаткаваны на будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў, фермаў. Яны акупяцца ў перспектыве. У той жа час затраты на вытворчасць прадукцыі (гаруча-змазачныя, будаўнічыя матэрыялы, мінеральныя ўгнаенні) — 104 трлн рублёў. А гэта значыць, што 34 трлн рублёў не хапае для нармальнай работы АПК. І ў гэтым недапрацоўкі і фінансава-крэдытнай сістэмы. «Трэба даць уздыхнуць сельгаспрадпрыемствам, крэдытныя рэсурсы пры цяперашняй стаўцы кладуцца на іх плечы цяжкай ношай», — адзначыў Міхаіл Русы.

Для слабых гаспадарак прадастаўляецца магчымасць рэфармавання, прыцягнення інвестара, якому даюцца пэўныя прэферэнцыі. Прапаноўваецца па дагаворы адтэрміноўка на тры гады з аплатай не поўнай стаўкі рэфінансавання, а адной яе трэці. Гэта дае магчымасць інвестару ўкласці грошы ў вытворчасць, за 2-3 гады палепшыць справы, павялічыць выпуск прадукцыі і разлічыцца. «Пры гэтым запазычанасць нікому спісвацца не будзе», — папярэдзіў віцэ-прэм'ер.

Плануецца таксама ўдасканаліць сістэму дзяржаўнай падтрымкі сяла. Палова яе цяпер накіроўваецца на кампенсацыю працэнтаў па банкаўскіх крэдытах. У перспектыве яна будзе размяркоўвацца на агульнадзяржаўныя мерапрыемствы. У прыватнасці, на дапамогу чарнобыльскім рэгіёнам, навучальным установам, падрыхтоўку кадраў, меліярацыю.

Больш прыцягальным стане і дзяржзаказ для арганізацый аграпрамысловага комплексу. Ужо сёння прымаюцца адпаведныя меры. «З 2015 года селянін да 1 красавіка будзе ведаць, па якой цане ў яго купяць прадукцыю паводле дзяржзаказу», — адзначыў Міхаіл Русы. На працягу 60 дзён павінен быць выплачаны аванс. Пры гэтым не дазваляецца ніякі бартар, усе разлікі — толькі грашыма.

Неабходна рыхтаваць на месцах свае кадры, а не браць «прышлых» з іншых рэгіёнаў — мякка кажучы, купляць ката ў мяшку. Ад гэтага таксама залежаць вынікі дзейнасці канкрэтнага прадпрыемства і рэгіёна.

Старшыня Мінскага аблвыканкамі Сямён ШАПІРА звярнуў увагу кіраўнікоў на беражлівае стаўленне да кожнага працаўніка. «Той жа механізатар на сяле павінен мець хоць бы адзін выхадны на тыдзень», — лічыць старшыня Мінаблвыканкама.

У некаторых раёнах Міншчыны змянілася да 50% кіраўнікоў сельгасарганізацый. Гэта ненармальная сітуацыя. Чалавек не паспеў адпрацаваць год (за гэты час ён толькі ўнікае ў сітуацыю, вучыцца), а яго старшыня райвыканкама сваім распараджэннем здымае з пасады. Такая практыка недапушчальная. Усе звальненні з цяперашняга моманту будуць узгадняцца з аблвыканкамам.

Сямён Шапіра нагадаў, што трэба рыхтаваць на месцах свае кадры, а не браць «прышлых» з іншых рэгіёнаў — мякка кажучы, купляць ката ў мяшку. Ад гэтага таксама залежаць вынікі дзейнасці канкрэтнага прадпрыемства і рэгіёна. У якасці прыкладу ён прывёў Любанскі раён, дзе гаспадаркі ўзначальваюць свае, тутэйшыя людзі.

Нагадаю, рабочая група падрыхтавала «дарожную карту» па развіцці аграпрамысловага комплексу, праект дырэктывы аб мерах па павышэнні канкурэнтаздольнасці сельгасарганізацый і прэстыжу работы ў АПК, а таксама шэраг нарматыўных актаў. Папярэднія вынікі былі прадстаўлены кіраўніку дзяржавы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■



Фота БЕЛТА.

ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ Ў МАІ

З мая гэтага года ў Беларусі павялічыліся аднаразовыя дзіцячыя дапамогі і дапамогі на дзяцей-інвалідаў, якія вылічваюцца ў залежнасці ад памеру бюджэту пражытачнага мінімуму.

Нагадаем, што з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года памер бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ) у краіне складае 1 212 470 рублёў. Памеры дапамог па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, які вылічваюцца ад памеру сярэдняй зарплаты беларусаў, не змяніліся. Згодна з інфармацыяй Белстата, летась у рэспубліцы нарадзілася 118 463 дзіцяці, што на 2 570 дзяцей больш, чым у папярэднім. Больш за ўсё нованароджаных налічвалася ў 2013 годзе ў Мінску — амаль 23 тыс., менш за ўсё — у Магілёўскай вобласці (13,1 тыс. дзяцей).

Святлана БУСЬКО.

НАВІНЫ

ПРА АДКЛЮЧЭННЕ ВАДЫ ПАДКАЖА «ЯНДЭКС»

Інфармацыя адносна тэрмінаў адключэння гарачай вады ў Мінску цяпер даступная ў пошуку «Яндэкса», паведамілі ў прэс-службе гэтай кампаніі.

Карыстальнікі ўжо сёння, не чакаючы аб'явы на пад'ездзе і не марнуючы часу на пошук спецыялізаванага сайта, могуць даведацца, калі не будзе вады ў іх доме. Дастаткова ў пошукавіку ўвесці запыт накшталт «адключэнне гарачай вады летам» і набраць свой адрас (вуліцу і нумар дома). Звесткі пра графік прафілактычных работ прадастаўляе РУП «Мінскэнерга», а «Яндэкс» прыводзіць іх у зручны для карыстальнікаў від.

Як зазначылі ў кампаніі, беларусы пачынаюць цікавіцца графікам адключэння гарачай вады ўжо з сярэдзіны вясны. Летась з пачатку красавіка і да пачатку жніўня яны задалі «Яндэксу» некалькі дзясяткаў тысяч такіх запытаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗЕЦІ — ГЭТА «ХОРоШОУ»

Папулярны праект тэлеканала СТБ — міжнародны музычны конкурс «ХОРоШОУ» — атрымаў працяг. На гэты раз у Мінск прыехалі дзіцячыя хоры — з Эстоніі, Чэхіі, Расіі, Літвы; натуральна, таксама прадставіла свайго ўдзельніка і Беларусь.

Задача перад калектывамі стаіць няпростая — не толькі шчыра і эмацыянальна, але і пераканаўча і прафесійна выканаць на сцэне дзіцячыя песні, нацыянальныя калыханкі, а таксама сусветна вядомыя хіты. Прычым «падкупіць» журы адным толькі дзіцячым абаяннем не атрымаецца. Бо, адзначае намеснік генеральнага дырэктара тэлеканала, прадзюсар праекта Настасся Гузель-Ганіева, сярод суддзяў «ХОРоШОУ» — заслужаныя і народныя артысты Беларусі... са сваімі дзецьмі і ўнукамі, і калі ў Аляксандра Ціхановіча можа быць адзін падыход да ацэнкі, то ў яго ўнука Івана — зусім іншыя густ і крытэрыі.

Зрэшты, пераможцамі ў гэтым праекце стануць абсалютна ўсе ўдзельнікі — кожны дзіцячы хор будзе ўзнагароджаны дыпломам у пэўнай намінацыі. Паглядзець і паслухаць канцэрты можна будзе ў эфіры СТБ 18, 25 мая, а таксама 1 чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАДЗЕІ

ПАЛЯЎНІЧЫ СТРЭЛІЎ У... ЛАЙКУ

Супрацоўнікі Мінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пачалі адміністрацыйны працэс у дачыненні да паляўнічага, які смяротна параніў... сабаку.

— Знаходзячыся на сваім лецішчы ў Смалявіцкім раёне, мужчына заўважыў, што да яго на ўчастак забегла паляўнічая лайка. Зарадзіўшы ружжо, ён стрэліў у жывёлу, — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Як патлумачыў парушальнік, гэта быў не першы выпадак, калі паляўнічыя сабакі з'яўляліся на тэрыторыі садаводчага таварыства. Што не дзіўна, паколькі знаходзіцца яно паблізу ад паляўнічых угоддзяў. Аднак, па неафіцыйнай інфармацыі, прычынай такога ўчынку мог стаць канфлікт інтарэсаў паміж паляўнічымі.

Гэты грамадзянін парушыў пункт правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванні, які забараняе накіроўваць зброю на чалавека, хатніх жывёл ці месцы іх размяшчэння. У адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, паляўнічы будзе пазбаўлены спецыяльнага права (на паляванне) на шэсць месяцаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАКТЫ

ХАЧУ БЫЦЬ МУЖЧЫНАМ!

У Беларусі за 20 гадоў змянілі пол каля 70 чалавек, паведаміў БЕЛТА ўрач-сексолаг Дзмітрый Капусцін.

«Ва ўсім свеце жаданне змяніць пол часцей выказваюць мужчыны, але ў краінах СНД сітуацыя іншая: жанчыны часцей хочуць стаць мужчынамі. Чаму так адбываецца, пакуль невядома», — адзначыў ён.

На ўліку ў Мінскім гарадскім сексалагічным цэнтры знаходзяцца 170 чалавек, якія хочуць змяніць пол (практычна аднолькава мужчын і жанчын). У асноўным гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 23 да 26 гадоў. Дазвол на аперацыю атрымліваюць каля чатырох чалавек у год. У Беларусі такі дазвол выдае спецыяльна створаная Міжведамасная камісія па медыка-псіхалагічнай і сацыяльнай рэабілітацыі асоб з сіндромам адмаўлення полу. У яе склад уваходзяць 15 спецыялістаў міністэрстваў аховы здароўя, абароны, унутраных спраў, юстыцыі, адукацыі. Камісія накіроўвае пацыента на псіхолага-псіхіятрычнае і сексалагічнае абследаванне. Праз год, пасля дасканалага абследавання ў псіхіятраў, сексолагаў, уролагаў, гінеколагаў, эндакрынолагаў і генетыкаў, савет прымае рашэнне — змяняць гэтаму чалавеку пол або не.

Гаворачы аб пераможцы конкурсу песні «Еўрабачанне-2014» — так званай барадатай жанчыне Канчыце Вурст, беларускі сексолаг адзначыў, што, хутчэй за ўсё, выканаўца — трансвестыт, а не транссексуал. «Хутчэй за ўсё, Вурст — гэта чалавек, які атрымлівае задавальненне ад нашэння адзення процілеглага полу. Толькі і ўсяго. Гэта як на карнавале, толькі карнавал прадаўжаецца некалькі гадзін, а тут больш доўгі тэрмін», — сказаў Дзмітрый Капусцін.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

ОРГАНИЗАТОР: ЧАШНИКСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Адрес земельного участка	Витебская обл., Чашникский р-н., г. Чашники, пер. Базарный, район магазина «Все для дома»
Кадастровый номер участка	225150100001001875
Площадь, га	0,0155
Целевое назначение (назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)	Для строительства и обслуживания магазина (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)
Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений и сооружений; инженерно-геологические условия*	Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В.
Условия проведения аукциона	Наличие не менее двух участников. Заключение с Чашникским районным исполнительным комитетом соглашения. Победителю аукциона либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в аренду: - возместить расходы, связанные с проведением аукциона; - внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; - заключить с Чашникским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка; - обратиться в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на него в Чашникское бюро Лепельского филиала республиканского унитарного предприятия «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; - получить в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года; - занять данный участок в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него; - снять плодородный слой с площадок застройки и использовать его для благоустройства отводимого участка
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД
Срок аренды (лет)	20
Начальная стоимость (руб.)	5 487 035
Сумма задатка (руб.)	548 703
Стоимость расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению (руб.)	3 164 400
Дата и место проведения аукциона, сроки приема документов	Аукцион **состоится 18 июня 2014 года в 15-00** по адресу: г. Чашники, ул. Советская, 44 (здание райисполкома), кабинет № 37. Заявления и пакет необходимых документов предоставляются участниками с 8.00 до 17.00 **по 12 июня 2014 года** включительно по адресу: г. Чашники, ул. Космонавтов, 2, кабинет № 3 (земслужба)

** Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ.*

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка, кроме того, в комиссию предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3600329002002 в ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, МФО 150801647, УНП 300594330, код платежа 04002, получатель – главное управление Министерства финансов по Витебской области.

Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактные телефоны: 8 (02133) 4-24-05, 4-14-46.

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукционов с условием по продаже права заключения договора аренды земельного участка

ЛОТ № 1	
Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства и обслуживания спортивно-туристического комплекса (без размещения посетителей для проживания) в к.п. Нарочь, ул. Туристская, площадью – 0,3317 га (кадастровый номер 624056300001000400). **Срок аренды 99 лет. Начальная цена 601 773 789 (Шестьсот один миллион семьсот семьдесят три тысячи семьсот восемьдесят девять) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
ЛОТ № 2	
Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства и обслуживания спортивно-туристического комплекса (рекреационная емкость объекта для размещения посетителей на проживание 18 человек и единовременного пребывания 45 человек) в к.п. Нарочь, ул. Набережная, площадью – 0,8754 га (кадастровый номер 624056300001000399). **Срок аренды 99 лет. Начальная цена 918 386 228 (Девятьсот восемнадцать миллионов триста восемьдесят шесть тысяч двести двадцать восемь) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
ЛОТ № 3	
Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства и обслуживания торгового объекта в г. Мядель, ул. Юбилейная, площадью – 0,4892 га (кадастровый номер 624050100001001737). **Срок аренды 99 лет. Начальная цена 636 608 924 (Шестьсот тридцать шесть миллионов шестьсот восемь тысяч девятьсот двадцать четыре) белорусских рубля.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации, с потерями сельскохозяйственного производства. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
Продавец	Мядельский районный исполнительный комитет
Организатор аукциона	Мядельский районный исполнительный комитет
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность для юридического лица копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3600623001906 ЦБУ № 619 филиала № 601 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Молодечно, код 769 УНП 600537220. Получатель платежа: Главное управление МФ РБ по Минской области.
Конечный срок и адрес приема заявок	**13 июня 2014 г. до 16.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 14, Мядельский районный исполнительный комитет, тел.: (факс) (8-01797) 55-5-73, (8-1797) 55-4-00**
Дата, время и место проведения аукциона	**18 июня 2014 г. в 14.00 г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 36, Мядельский районный исполнительный комитет**

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Строительство многоэтажного односекционного жилого дома со встроенными помещениями торгово-общественного назначения № 72 по генплану по ул. Ясной»,
опубликованной в газете «Звязда» 28.03.2014 года
следующего содержания:

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, каб. 12. **Тел. 8 (017) 216 00 09.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц двухкомнатные, трехкомнатные, четырехкомнатные и пятикомнатные квартиры:

при 100% оплате в течение 3 дней стоимость 1 м² **1250** долларов США, при оплате в рассрочку (30% в течение 5 дней, остаток ежемесячно равными долями по декабрь 2014 года) стоимость 1 м² **1300** долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, и заключение договоров создания объектов долевого строительства осуществляется уполномоченным агентством недвижимости – **ОДО «ТВОЯ СТОЛИЦАКОНСАЛТ»** по адресу: 220072, г. Минск, пр. Независимости, д. 68, к. 127.

Тел.: 8 (017) 215 00 30, 8 (029)371 01 01, 8 (029)381 01 01.

УНП 100070331

Утерянные страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев ТС: ВР №4721203, ВР №4721226, ВС №3012601, ВС №7394339, ВС №7394340, ВС №8404890, ВС №8404976; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев ТС на территории государств-членов системы «Зеленая карта»: BY/03/№07665627; квитанции формы 1-СУ о приеме наличных денежных средств (страховых взносов): КС 3170391, КС 3170392, КС 3170395, КС 3766622, КС 3802927 **считать недействительными.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
по продаже права заключения договора аренды помещений транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

№ лота	**1**
Наименование, местонахождение и характеристика объекта	Право заключения договора аренды отдельных помещений общей площадью 87,4 кв.м (характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение и водоотведение, телефонизация) на 1-м этаже здания вокзала (инв. № 100/С-47089) по ул. Кижеватова, 1Б/1 в г. Бресте
Балансодержатель	Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги»
Начальная цена продажи (руб.)	1 714 110
Сумма задатка (руб.)	171 400
Срок аренды	5 лет
Ставка арендной платы	6 856 603 рубля (67,22 базовой арендной величины на момент заключения договора аренды)
Условия оплаты	разовый платеж
Размер штрафа, руб.	15 000 000
Условия продажи	для размещения парикмахерской
Организатор аукционных торгов	**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

ПРИМЕЧАНИЕ:

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:

копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3. индивидуальным предпринимателем:

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 19 июня 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 19.05.2014 г. до 17.30 13.06.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by

В связи с реорганизацией ОАО «Спецмонтажавтоматика» профсоюзным собранием (протокол № 2 от 21.03.14 г.) ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ О РЕОРГАНИЗАЦИИ ПЕРВИЧНЫХ ПРОФСОЮЗНЫХ ОРГАНИЗАЦИЙ ОАО «Монтажавтоматика» (УНП 101126320) и ОАО «Промспецавтоматика» (УНП 101013735) путем присоединения к первичной профсоюзной организации ОАО «Спецмонтажавтоматика». Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220073, г. Минск, ул. Гусовского, 6, тел. 251-20-15.

АРХІВЫ НЕ МАЎЧАЦЬ

Як вынішчалі вёскі Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей

Камітэт дзяржаўнай бяспекі перадаў у Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь архіўныя дакументы аб вынішчэнні вёсак і мясцовых жыхароў нямецка-фашысцкімі акупантамі і іх памагатымі ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях у гады Вялікай Айчыннай.

Як паведамляюць у прэс-службе КДБ, цэнтральны архіў камітэта вядзе пошук адпаведных архіўных дакументаў з пачатку гэтага года ў межах міжнароднага праекта «Павышэнне статусу ўратаваных жыхароў спаленых беларускіх вёсак». Ужо знойдзена і будзе ўключана ў электронную базу звестак звыш 70 дакументаў. База «Беларускія вёскі, вынішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны» размяшчаецца на сайце Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Сярод перададзеных дакументаў — акты раённых камісій садзейнічання рабоце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх памагатых і нанесеных імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР, даведак раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, пратаколы допытаў сведак злачынстваў, якія паведамляюць аб злачынствах германскіх акупацыйных войскаў на тэрыторыях Бягомльскага раёна Віцебскай вобласці, Барысаўскага, Грэскага, Лагойскага, Уздзенскага і Халопеніцкага раёнаў Мінскай вобласці, Бялыніцкага і Клічаўскага раёнаў Магілёўскай вобласці. Пошук і публікацыя архіўных дакументаў працягваецца.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Супраць тытуню

ДЗЕ СПОРТ, ТАМ БЕЗ ДЫМУ

Да канца мая працягнецца рэспубліканская інфармацыйна-адукацыйная акцыя «Беларусь супраць тытуню», асноўны акцэнт якой робіцца на інфармацыйнай падтрымцы чэмпіянату свету па хакеі з шайбай, як свабоднага ад тытуню. Акрамя таго, запланавана кансультаванне ва ўстановах аховы здароўя па праблеме развітання з залежнасцю, культурна-масавыя, аздараўленчыя мерапрыемствы. Пазіцыя Міністэрства аховы здароўя тут адназначная, што цалкам зразумела.

— Нікацін, як вядома, наносіць магутны ўдар па сасудах. Яны рэзка скарачаюцца — прычым і буйныя артэрыі, якія сілкуюць, напрыклад, галаўны мозг, і самыя дробныя, якія сілкуюць вочы. З узростам курцы забяспечваюць сабе больш высокую верагоднасць займець пэўныя захворванні вачэй, чым тыя, хто не курыў або своечасова развітаўся са шкоднай звычкай, — тлумачыць **інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ.**

Сёння вядома, што той, хто жыве з курцом, таксама рызыкуе сваім здароўем. У іх развіваюцца захворванні, уласцівыя курцам — сардэчна-сасудзістыя, анкалагічныя, органаў дыхання, страўнікава-кішачнага тракта, касцявой сістэмы, вачэй, скуры.

Тытунёвы дым, якім дыхаюць і курэц, і навакольныя, змяшчае ў 50 разоў больш канцэрагенаў і аміяку, у 5 разоў больш вокісу вугляроду, у 2 разы больш смол і нікаціну, чым паступае ў арганізм таго, хто зацягваецца.

Як любая залежнасць, курэнне проста прыкрывае пэўныя душэўныя перажыванні. Курэнне іх не вырашае, але нейкім чынам кампенсуе. Таму карысным будзе зварот да псіхолага або псіхатэрапеўта, парады тых, хто ўжо развітаўся з залежнасцю.

Звярнуцца па дапамогу дарослым можна ў псіхіятрычны дыспансер, дзецям і падлеткам — у дзіцячы псіханеўралагічны дыспансер, цэнтры дружалюбнага стаўлення да падлеткаў, паліклініку.

Алена БЕРАСЦЯНКА

■ 18 мая — Міжнародны дзень памяці памерлых ад СНІДу

НЕ НАЗЫВАЙЦЕ ІХ АХВЯРАМІ

У гэту нядзелю ва ўсім свеце будуць успамінаць тых, хто загінуў з-за ВІЧ/СНІДу, і адначасова нагадваць аб папярэджванні ВІЧ-інфекцыі, клопаце аб сабе і блізкіх, веданні свайго ВІЧ-статусу, адказным стаўленні да лячэння.

У нашай краіне зарэгістравана звыш 16 тысяч выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Большая частка новых выпадкаў прыпадае на ўзроставую групу пасля 40 гадоў. Спецыялісты адзначаюць, што 40-гадовыя недаацэньваюць рызыку ВІЧ. Праблема сапраўды пачыналася некалі з маладых: 15-20 гадоў таму распаўсюджванне ВІЧ было звязана з наркаспажываннем, інфіцыраваліся, галоўным чынам, тыя, каму да 25. Аднак сёння сітуацыя змянілася. Тым часам большасць людзей дагэтуль не лічыць неабходным рэгулярна здаваць тэст на ВІЧ.

Дзякуючы Інфармацыйнай стратэгіі па ВІЧ/СНІДу рэбрэндынг гэтай тэмы ўжо прынёс свае станоўчыя вынікі ў нашай краіне. Па выніках даследаванняў 2012 года, 42 працэнты публікацый у СМІ змяшчалі некарэктныя і абразлівыя выразы кшталту «чума», «ахвяры СНІДу» і інш. Летась у публікацыях вядучых беларускіх сродкаў масавай інфармацыі такія тэрміны ўжо не былі заўважаны.

Сёлета Экспертны савет Інфармацыйнай стратэгіі па ВІЧ/СНІДу ў Рэспубліцы Беларусь зноў звяртаецца да журналістаў і грамадскасці з просьбай не называць ВІЧ-пазітыўных людзей ахвярамі, паколькі гэтае слова сімвалізуе слабасць і асуджанасць, што не сумяшчаецца з актыўнай жыццёвай пазіцыяй многіх людзей са станоўчым статусам. Дзякуючы сучасным магчымасцям антырэтравіруснай тэрапіі з ВІЧ можна захоўваць якасць жыцця — пры ўмове вытрымлівання рэкамендацый урача і правілаў бяспечных паводзін.

P.S. Міжнародны дзень памяці памерлых ад СНІДу адзначаецца ў свеце кожную трэцюю нядзелю мая. Упершыню такі дзень адзначылі ў Сан-Францыска ў 1983 годзе. Сімвал падтрымкі людзей, якія жывуць з ВІЧ, — чырвоная стужка, прышпіленая да адзення.

Святлана БАРЫСЕНКА

УЗНАГАРОДА З ПРЫСМАКАМ ЧЫЗКЕЙКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Згодны з гэтым і **намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Марат МАРКАЎ,** які ўзначальваў беларускую дэлегацыю на «Еўрабачанні»: «Усё пазнаецца ў параўнанні. Была пэўная асцярога, бо тое, што мае дачыненне да артыста, які прадстаўляе краіну на гэтым конкурсе, мае арэол не заўсёды станоўчы. У выпадку з Юрам пасля першых сустрэч было разуменне, што ён вельмі пазітыўны чалавек. І гэта паўплывала на два ключавыя моманты: па-першае, стаўленне да артыста як з боку журналістаў, так і з боку дэлегацыі было добрым, і такой жа была атмасфера ў камандзе падчас падрыхтоўкі і працы на конкурсе; па-другое, стаўленне да нашай краіны фарміравалася на падставе настрою ў камандзе і вобразу нашага выканаўцы. Нас называлі самай пазітыўнай камандай на «Еўрабачанні».

— Паколькі я працую ў Нацыянальным акадэмічным аркестры, то, безумоўна, важна, што нас ацанілі ў Міністэрстве культуры, — падзяліўся эмоцыямі Юрый Вашчук. — Я да гэтай пары знаходжуся яшчэ ў нейкім эйфарычным стане. Прыемна бачыць і адчуваць, як людзі радуюцца за мяне. Калі дабраўся да сацыяльных сетак, то нават быў гатовы праслязіцца, бо ўсведамляю, наколькі рэакцыя людзей, якія мяне падтрымлівалі, шчырая. Хочацца, каб беларусы так падтрымлівалі сваіх і ў музыцы, і ў спорце, і ва ўсіх іншых сферах.

Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Міхаіл ФІНБЕРГ таксама выказаўся пра свайго падапечнага:

— Мы працуем разам вось ужо 14 гадоў, і я ведаю, якую дарогу ў творчым плане прайшоў за гэты час артыст. Ён рос у атачэнні прафесіяналаў, заўсёды працаваў на ўзроўні. На такіх людзей варта раўняцца. Выступленне ў фінале — паказчык узроўню, дзе многае зроблена яго рукамі і галавой. Артыст вырас і шмат чаму навучыўся. Юра, я хачу, каб ты разумеў, — гэта толькі пачатак. Галоўнае — не разгубіцца на шляху.

Алена ДРАПКО.

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ Ў МІНСКУ

IIHF 2014 WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

Усё толькі пачынаецца

Беларуская зборная дала сапраўдны бой Фінляндыі, але так і засталася без перамогі — 0:2

Быў час, калі мы саступілі фінам 9 шайбаў... Што казаць, другая палова 90-х — час станаўлення айчыннай зборнай, калі славутыя каманды давалі нашым хлопцам урокі выдатнага хакея.

Прайшлі гады, і цяпер, на хатнім першынстве свету, беларусы пад роў «Мінск-Арэны» ўжо ціснуць двухразовых чэмпіёнаў свету да варот і прымушаюць Пеку Рынэ, былога варатара мінскага «Дынама», па-кашэчаму кідацца за шайбай. І гэта тыя фінскія львы, якія на сёлетнім чэмпіянаце далі самы адчувальны бой зборнай Расіі. Дружыне з усходу падапечныя Эркі Вестэрлунда саступілі толькі дзве шайбы. А пасля цяжкага, напружанага паядынку з Беларуссю, лёс якога вызначыў трапны кідок тэхнара Петры Канціёлы, трэнер прызнаўся:

— Нам супрацьстаяў моцны, сур'ёзны сапернік з добрай арганізацыяй гульні і якаснымі хакеістамі ў складзе. Я вельмі ганаруся сваімі гульцамі. Яны змагаліся, як львы, і прадэманстравалі, што наша каманда з'яднаная.

ВЫНІКІ МАТЧАЎ

15 мая. Група А («Чыжоўка-Арэна»). Канада — Данія — 6:1, Швецыя — Францыя — 2:1.

Становішча камандаў (пасля 4 гульнявых дзён): Швецыя — 11 балаў, Канада — 10, Чэхія — 6, Нарвегія — 6, Францыя — 5, Славакія — 4, Данія — 3, Італія — 3.

Група В («Мінск-Арэна»). ЗША — Латвія — 5:6, Фінляндыя — Беларусь — 2:0.

Становішча камандаў. Расія — 12, Латвія — 9, Фінляндыя — 6, ЗША — 6, Беларусь — 6, Германія — 5, Швейцарыя — 3, Казахстан — 1.

Упэўнены, з вуснаў 57-гадовага фінскага спецыяліста прагучалі не проста прыемныя кампліменты. Свае апошнія матчы на турніры беларусы правадзяць класна, пастаянна нарошчваючы націск у атацы. Аднак атрыманыя намі дзве вікторыі над Латвіяй і Швейцарыяй не гарантуюць месца ў чвэрцьфінале. Для таго, каб славакам прайсці ў плэй-оф у 2012 годзе, ім давялося набраць на групавой стадыі 15 балаў! У беларусаў іх пакуль 6, і яшчэ чакаюць тры групавыя паядынкі — з Германіяй, Латвіяй і Расіяй. І калі ўдзел расіян у чвэрцьфінале нават не абмяркоўваецца, усе астатнія каманды таксама прэтэндуюць на далейшае праходжанне. Відавочна, толькі перамогі забяспечаць нам месца ў накаўт-раўндзе. Першую са звышадказных сустрэч беларусы правядуць ужо сёння. У 16:45 пачнецца матч з Германіяй.

«Трэба перамагаць»

Глен ХЭНЛАН, галоўны трэнер зборнай Беларусі, падвёў вынікі паядынку са зборнай Фінляндыі:

— Гэта быў цудоўны матч. І я ўсцешаны тым, што мы прадэманстравалі ў ім выдатную гульню. На працягу апошніх гадоў я захапляюся хакеем зборнай Фінляндыі і ўважліва сачу за ёй. У нашай камандзе шайбай пераважна валодалі Калюжны, Касціцын, Грабоўскі, лідары каманды, у якіх атрымлівалася закідваць. Сёння шайбу ў беларускія вароты закінуў Канціёла. Ён зрабіў для Фінляндыі тое, што вышэй пералічаныя хакеісты рабілі ў папярэдніх матчах за нас.

Мы валодалі шайбай, у нас хапала шанцаў закінуць пры гульні ў большасці, але добра дзейнічаў фінскі галкіпер. Чаму ў варотах згуляў Лаланд? Коваль прыхварэў, Мезін таксама сябе не вельмі добра адчуваў. Таму я даверыўся гэтаму варатару, і ён згуляў выдатна.

Хачу акцэнтаваць увагу на тым, што нам цяпер трэба перамагаць у сваіх матчах. Не так важна, якое цяпер турнірнае становішча. Здарыцца можа ўсё, што заўгодна. Калі наша каманда будзе гуляць так, як супраць Фінляндыі, у нас ёсць шанцы прайсці далей.

«Салей быў маім блізкім сябрам»

Фінская зборная на сёлетнім першынстве прадстаўлена пераважна хакеістамі з еўрапейскіх чэмпіянатаў. На фоне іншых сваёй багатай біяграфіяй вылучаецца форвард канадскай каманды «Вініпег Джэтс» Олі ЁКІНЭН. У НХЛ ён выступае з 1997 года і агулам правёў у тамтэйшай лізе больш за тысячу матчаў. Пасля супрацьстаяння з Беларуссю Олі адказаў на нашы пытанні.

— У другім перыядзе ў нас было даволі шмат выдаленняў. Пры гэтым калі гулялі 5 на 5, выглядалі добра. Зноў выручаў каманду варатар Пека Рынэ, — прызнаецца 35-гадовы капітан зборнай Фінляндыі. — Сярод беларусаў шмат майстравітых хакеістаў. Адзін хлопец пастаянна хацеў прайсці ўсіх і ўвайсці ў нашу зону. Але мы змаглі стрымаць яго.

— Якая частка гульні была найбольш складанай?

— Не ведаю. Галоўнае, што мы выстаялі, калі гулялі ў меншасці. Для арбітраў быў таксама цяжкі матч. Разумею, як складана дзейнічаць, калі свісцяць 15 тысяч чалавек. Мы стараліся шмат рухацца і ў выніку зарабілі тры балы.

— Што здарылася пасля завяршэння першага перыяду, калі Іра Пакарынэн ледзь не накінуўся на Міхаіла Грабоўскага?

— Беларус кінуў па нашых варотах ужо пасля сірэны. Думаю, так рабіць нельга. Я не бачыў такога ў Паўночнай Амерыцы. Падобнае заслугоўвае 10 хвілін штрафу.

— Дарэчы, як вам сёлетні чэмпіянат?

— Я не гуляў на чэмпіянаце свету 6 гадоў і не магу параўнаць мінскі чэмпіянат з мінулымі спаборніцтвамі. Але ў Беларусі жывуць вельмі прыемныя, гасцінныя людзі, а Мінск — чысты, неверагодны горад з добрымі рэстаранамі.

— Здолелі ўжо пагуляць па сталіцы?

— Не, але, каб выказаць павагу Руслану Салею, я наведаў яго магілу. Мы два гады правялі разам з ім у «Флорыдзе». Руслан быў маім вельмі блізкім сябрам. Я прысутнічаў на жалобнай службе ў Анахайме, але трапіць на пахаванне не здолеў.

Тарас ШЧЫРЫ.

Імгненні чэмпіянату

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Суседзі

PL-BY-UA 2007-2013

«Планета ідэй»: як падрыхтаваць турыстычны праект?

Гэты праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам

ІНІЦЫЯТЫЎНЫМ ЛЮДЗЯМ ДАПАМОГУЦЬ У АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ЦІКАВЫХ ЗАДУМ

Для таго, каб Беларусь напоўніцу выкарыстоўвала свой турыстычны патэнцыял, нядосыць толькі адраджэння, папулярызацыі аб'ектаў нашай мінуўшчыны і стварэння дастойнай інфраструктуры для абслугоўвання турыстаў. Трэба, каб гэтай справай займаліся ініцыятыўныя, кампетэнтныя людзі — не толькі з жаданнем працаваць у гэтай сферы, але і з уменнем увасобіць цікавую ідэю ў паспяховы турыстычны прадукт, які будзе добра запатрабаваны. З выгадай для яго арганізатараў і гэтага рэгіёна.

Такую задачу цяпер вырашае праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі **«Планета ідэй — трансгранічны трансфер ведаў у галіне прыцягнення інвестыцый для развіцця памежнага турызму» (грант-кантракт №IPBU.03.01.00-58-602/11-00).** Ён фінансуецца са сродкаў еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства па Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча–Беларусь–Украіна» на 2007–2013 гады. З беларускага боку партнёрамі праекта з'яўляюцца Гродзенскае абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» і ўпраўленне спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама, з польскага — Цэнтр садзейнічання інавацыям і развіццю (г. Беласток), з украінскага — Валынскі фонд падтрымкі прадпрымальніцтва (г. Луцк). Бюджэт праекта складае каля 350 тысяч еўра — у асноўным са сродкаў Еўрапейскага саюза, а таксама Гродзенскага аблвыканкама.

— Наша галоўная мэта — умацаванне супрацоўніцтва паміж беларускімі, польскімі і ўкраінскімі арганізацыямі, якія займаюцца пытаннямі турызму. Пры гэтым ноу-хау ў тым, каб не проста генерыраваць новыя сумесныя праекты, але і садзейнічаць іх падрыхтоўцы і рэалізацыі, — зазначае **каардынатар праекта «Планета ідэй» Сяргей КАЛЯДА.**

У рамках праекта праводзіцца абучэнне супрацоўнікаў грамадскіх арганізацый, мясцовых органаў улады, турысцка-інфармацыйных цэнтраў і іншых устаноў, якія дзейнічаюць у сферы турызму на памежных тэрыторыях Польшчы, Беларусі і Украіны. З імі працуюць эксперты, каб сумесна вызначыцца: у якім турыстычным кірунку варта рухацца таму ці іншаму рэгіёну? Якія рэсурсы для выкарыстання свайго патэнцыялу ўжо ёсць, а чаго не хапае? Што можна стварыць? Усюды ёсць нейкія адметнасці. «Фішкай» у адным раёне можа, напрыклад, стаць цікавая анімацыйная праграма каля помнікаў сярэднявечча. У іншых — турыстычныя маршруты і мерапрыемствы, звязаныя з падзеямі Першай і Другой сусветных войнаў, унікальнымі прыроднымі славутасцямі, актыўным адпачынкам, музычнымі імпрэзамі. А дзесьці, магчыма, патрабуюцца новыя ідэі для лепшай прывабнасці ўжо традыцыйных рэгіянальных фестываляў ...

Эксперты не збіраюцца складаць замест удзельнікаў абучэння праекты і заяўкі для ўдзелу ў конкурсе Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва. Але яны дапамогуць сваімі ацэнкамі і парадамі, як гэта найлепш зрабіць. Прычым не толькі тое, што тычыцца зместу праекта, але і з пункту гледжання сучасных падыходаў да арганізацыі турызму, эканамічных разлікаў, юрыдычных і рэкламных пытанняў, граматнага афармлення заявак.

Удзельнікі праекта «Планета ідэй».

На другім этапе эксперты ў кожнай з трох краін вызначаць па 10 лепшых ідэй, якія будуць прэзентаваны партнёрам па міжнародным праекце ў Беларусі, Польшчы і Літве. Не выключана, што некаторыя з іх аб'яднаюцца ў стварэнні сумесных турыстычных мерапрыемстваў.

Пры гэтым «Планета ідэй» не абмяжоўвае свае задачы толькі ўдзельнікамі праекта. Чакаецца, што яны, прайшоўшы навучанне, падзеляцца атрыманымі ведамі са сваімі землякамі, якія таксама зацікаўлены ў турыстычнай дзейнасці, будуць з імі ў цесным партнёрстве. І, такім чынам, сумеснымі намаганнямі могуць фарміраваць турыстычныя прадукты гэтага рэгіёна.

Са свайго боку, арганізатары праекта «Планета ідэй» пасадзейнічаюць у пошуку замежных партнёраў у рамках трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча–Беларусь–Украіна» (цяпер рыхтуецца новая праграма на 2014–2020 гады). Створаны інтэрнэт-сайт **i-planeta.eu** для аўтараў турыстычных ідэй з трох суседніх краін, дзякуючы якому паміж імі будуць наладжвацца кантакты і фарміравацца сумесныя праекты.

Акрамя таго, у рамках праекта «Планеты ідэй» прадугледжана выдаць метадычны дапаможнік для работы ў праектах міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва.

Па пытаннях, што знаходзяцца ў сферы праекта «Планета ідэй», можна звяртацца да яго каардынатара на Гродзеншчыне Сяргея Іванавіча Каляды: e-mail: Koleda.s.i@gmail.com, тэл: +375 29 6502073.

УНП 590373966

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Наш культурны асяродак

Жыpандоля

Выпуск № 13 (230)

■ Ведай нашых!

Спеўнае Дэльфійскае «золата»

Саліст беларускай оперы Павел Пятроў заваяваў прэстыжную міжнародную ўзнагароду

Ён перамог у намінацыі «Акадэмічныя спевы» на 1-ых адкрытых маладзёжных Еўрапейскіх Дэльфійскіх гульнях у Валгаградзе. Яны праходзілі пад патранатам ЮНЕСКА і Міжнароднага Дэльфійскага камітэта. Гэтыя гульні — у нечым падобныя на Алімпійскія, толькі праходзяць сярод творцаў ва ўсіх відах мастацтваў. Сёлета яны аб'ядноўвалі прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў Расіі і яшчэ 26 краін свету. Удзел у гульнях сам па сабе прэстыжны, але пераможцы звяртаюць на сябе ўвагу прафесіяналаў у свеце мастацтваў, што можа паспрыяць іх далейшай кар'еры.

Што да Паўла Пятрова, то ён з 2012 года з'яўляецца салістам Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, вядомы аматарам класічнай музыкі па партыях Ленскага ў оперы «Яўген Анегін»(П. Чайкоўскага), Маладога цыгана ў «Алека» (С. Рахманінава), Берандзея ў «Снягурцы» (М. Рымскага-Корсакава) і іншых. Малады артыст (у 2011 ён паступіў у Беларускую акадэмію музыкі) ужо быў адзначаны на міжнародных конкурсах. Летась ён атрымаў першую прэмію на Міжнародным конкурсе оперных спевакоў імя Марыі Біешу ў Кішынёве, а таксама адзначаны другой прэміяй Міжнароднага конкурсу вакалістаў імя Станіслава Манюшкі.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

■ Гід «Звязды»

НОЧ МУЗЕЯЎ: КАБ НЕ ЗГУБІЦЦА Ў ЧАСЕ

Апрануцца ў гадзіннік

Нацыянальны мастацкі музей зацягвае ў «лабірынты часу»

Тут 17 мая поўна нечаканасцяў. Нерухомыя скульптуры раптам падораць усмешку, а потым стаіш і чакаеш, каб не прапусціць ледзь улоўны рух, пакуль скульптура зноў не вернецца да нерухомасці. Як ажываюць скульптуры, у Ноч музеяў прадэманструе творчая майстэрня Алега Усава «Джокерс».

Акрамя таго, каб пабачыць дзеянне нерухомых скульптур, нам дадуць магчымасць пачуць гучанне жывапісу, нават зладзіць своеасаблівы дыялог з творцам. Асабліва, калі гэты творца — Хаім Суцін, ураджэнец Смілавіч, які сцвердзіўся як прадстаўнік Парыжскай школы. Цяпер яго імя і творчасць вяртаецца ў кантэкст беларускай культуры. Інтэрактыўная інсталяцыя на аснове прац мастака дапаможа зразумець сутнасць яго вобразаў і перыпетый лёсу, у якім дагэтуль застаюцца невядомыя старонкі.

Наогул гэтай ноччу тут ёсць магчымасць для «Пераасэнсавання класікі» — гэта мультымедыйны праект, які прадставіць 15 твораў са збору Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу. Але не менш за класіку хвалюе сучаснасць. Яна можа прыцягваць нават шляхам шантажу — а хто сказаў, што гэта не прыдатны прыём, каб зацікавіць мастацтвам? «Шантаж атракцыёнаў» — гэта праект трох айчынных мастакоў: Руслана Вашкевіча, Сяргея Грыневіча, Аляксандра Бельскага. Такім чынам, у музеі сплятаюцца розныя эпохі, мастацкія стылі. Ноч тут будзе доўжыцца да 5 гадзін раніцы 18 мая. І некаторыя шчасліўчыкі правядуць яе ў музеі бясплатна: трэба толькі стварыць свой адмысловы гадзіннік як частку касцюма.

«Пояс Вітаўта» як галаграма

У свой «Музей свядомасці» запрашае Нацыянальны гістарычны

Не менш прывабнае падарожжа — па прасторах свядомасці. Варта толькі даць волю плыні свядомасці, і яна вынесе да ўспамінаў, якія жывуць глыбока ў памяці як асобных людзей, так і народаў. Выдатны вечар, каб азнаёміцца з экспазіцыямі «Старажытная Беларусь», «Беларусь XVI-XVIII ст. у партрэтах і геральдыцы», «Мастацтва ў гарадской культуры канца XIX — пачатку XX стагоддзя», а таксама даведацца пра тое, хто такі Іосіф Гашкевіч, і паглядзець на новае жыццё нацыянальных скарбаў. Дарэчы, некаторыя з нашых гістарычных каштоўнасцяў дзіўным чынам могуць з'явіцца перад намі ў выглядзе галаграм (нават такія, што ўявіць складана).

Спартыўных заўзятараў зацікавіць выстава «Алімпійская Беларусь». Дарэчы, наведвальнікі з квіткамі на чэмпіянат свету па хакеі маюць права на зніжку. Ёсць яшчэ адзін варыянт купіць квіток на акцыю танней: зрабіць самім вялікі лагатып Нацыянальнага гістарычнага музея. Напэўна, ахвотныя знойдуцца: акрамя экспазіцый чакаюцца тэатралізаваныя і музычныя выступленні, паказы мод, шоу мыльных бурбалак, а таксама музычна-светлавое.

Старыя добрыя казкі

У Доме-музеі I з'езда РСДРП прапануюць глядзець фільмы

Гэта фактычна падарожжа ў дзяцінства для дарослых, якія калісьці за савецкім часам маглі глядзець экранізацыі казак, створаныя на ўсходнегерманскай кінастудыі DEFA. А ці не цікава сённяшнім дзеткам паглядзець фільмы «Халоднае сэрца», «Тры арэшкі для Папялушкі», «Бяляначка і Розачка»?..

Узняцца па-над зямлёй

«КупалаLAND» паспрабуе стварыць Дзяржаўны музей Янкі Купалы

У гэтай краіне, якая ўмоўна называецца Зямля Купалы, мусіць быць свая газета — «КупалаNEWS», якую можна стварацьразам. У ёй кожны можа пайсці ўглыб жыцця і скласці свой унікальны радавод. Тут умеюць працаваць рукамі і робяць прыгожыя рэчы: іх нават можна набыць на handmade-кірмашы. Можна навучыцца рабіць лялек і танцаваць. Можна слухаць музыку: гуртоў Re1ikt, Folkmashina, HANDMADE, Rahis, ZnaRock, барда Сяргея Башлыкевіча. Тут працуюць тэатры «Адлюстраванні», «Укубе», «Жывое слова». Тут ёсць «Дзіцячы востраў». І жывуць рыцары. І нават дарослыя могуць адчуць сябе дзецьмі, радавацца, атрымаўшы ў падарунак паветраны шарык, а потым назіраючы, як яны ўздымаюцца ў неба: у гонар 70-годдзя музея. «Ноч» тут пачынаецца а 14-й гадзіне 17 мая і доўжыцца да паловы на трэцюю.

Кельты ў горадзе

Сярэднявечны горад у Траецкім прадмесці ад музея Максіма Багдановіча

Сярэднявечча — час, калі гарады маглі наладжваць стасункі адзін з адным, гандляваць. Цяпер можна адчуць, быццам да сучасных беларусаў завіталі прадстаўнікі кельцкіх народаў — ірландцы, шатландцы, валійцы. Свята праходзіць пад дэвізам: «Вясновы карагод: шатландскія рытмы, беларускія рыфмы». Рытмы забяспечаць майстар-класы па кельцкіх танцах. Пра дух Сярэднявечча нагадаюць рыцары. Пра Беларусь гасцям раскажуць нашы гурты «Бабэобі», «Нельга забыць» ды паэт Віктар Лупасін і музыка Цімафей Авілін. Ну, а фантастычную атмасферу створыць светлавое шоу.

Напісаць жаданне пяром Коласа

«Святло ў акне» запаліць Дзяржаўны музей Якуба Коласа

Пры жыцці Якуба Коласа дзверы дома заўсёды былі гасцінна расчынены для ўсіх добрых людзей. А калі на зямлю апускалася ноч і на мінскіх вуліцах паназваў змрок, у акне яго кабінета загаралася святло. Музей народнага паэта — адметная нацыянальная культурная прастора ў горадзе Мінску: мемарыяльная сядзіба і дом паэта захоўваюць яго непаўторную аўру святла і добразычлівасці. У год гасціннасці музей Якуба Коласа запрашае здзейсніць займальнае віртуальнае падарожжа ў краіны Еўропы і Азіі. Своеасаблівым лейтматывам разважанняў над жыццём, зносінамі, творчасцю стане ЧАЙ — адзін з самых дэмакратычных напояў, які аб'ядноўвае практычна ўсе краіны свету і людзей самых розных узростаў. Але самае галоўнае можа падарыць Беларусь: а 21-й гадзіне ахвотным дазволяць напісаць запаветнае жаданне пяром Якуба Коласа! Жаданні спаўняюцца пад музыку папулярных гуртоў і фаер-шоу.

Спатканне на даху

Прапануюць у галерэі Міхаіла Савіцкага

Але спачатку — спатканне з Аляксандрам Ісачовым, выстава твораў якога цяпер праходзіць у галерэі. У ёй 68 работ мастака, які стаў вядомы пасля смерці, а яго выставы выклікалі ажыятаж напрыканцы 80-х — пачатку 90-х гадоў. Але ў гэты вечар вас фактычна запросяць на баль з магчымасцю павучыцца танцаваць, як гэта рабілі калісьці ў XIX стагоддзі. А выйсці на вуліцу — і зноў вярнуцца ў стагоддзе XXI з яго рок-рытмамі. Спатканне на даху галерэі — прыз для асабліва актыўных наведвальнікаў.

Ноч музеяў у Брэсце і Камянцы: каралева Бона сустрэнецца з Львом Сапегам

Брэстчына далучаецца да міжнароднай акцыі «Ноч музеяў» пяты раз. Свята пройдзе ў абласным краязнаўчым музеі ў нядзелю 18 мая.

На гэты раз перад гледачамі «ажывуць» партрэты. Музей мае прыстойную галерэю партрэтаў дзеячаў розных эпох. Больш за дзясятак з іх пакажуць прафесійныя і самадзейныя артысты. Сцэнкі з жыцця каралевы Боны Сфорцы, канцлера ВКЛ Льва Сапегі, князя Уладзіміра Васількавіча, іншых палітыкаў, вучоных, асветнікаў, якія пакінулі свой след на нашых дарогах, убачаць наведвальнікі, — сказала загадчыца навукова-асветніцкага аддзела краязнаўчага музея Зінаіда Кульша. Зінаіда Іванаўна дадала, што падчас прадстаўлення будзе гучаць музыка XIX стагоддзя ў прафесійным выкананні. На вечар запланаваны тры сеансы: на 17.00, 19.00 і 21.00. А музей Камянецкай вежы падрыхтаваў на «Ноч музеяў» сярэдневяковую вечарыну.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

ПАЦАЛУНАК ДЛЯ ЦІМУРА

Ці магчымае кіно без бюджэтнага фінансавання і прадзюсара, які шукае прыбытак?

У Беларусі прэзентавалі калі не ўнікальны, то рэдкі праект — сямейны фільм кінакампаніі «Ілюзіён» «Цімур і каманда» па матывах аповесці Аркадзя Гайдара. Здымаўся фільм не на бюджэтныя або прадзюсарскія сродкі — выкарыстоўваўся грашовы прыз, які атрымала гэтая кінакампанія на міжнародным маскоўскім кінафестывалі «Прамяністы анёл» за папярэдні фільм «Калі ж пойдзе снег?» Калі прызавыя грошы скончыліся, прыйшоў час звяртацца да ўсемагутнага інтэрнэту і збіраць «з міру па нітачцы». Грошы сабралі — фільм зняты. Ці стаў ён такім жа выключным у мастацкім плане?

Дзеянне карціны разгортваецца ў нашы дні ў беларускай вёсцы Негарэлае, куды на лета да бабуль і дзядуляў прыязджаюць гарадскія дзеці. Хлопчык па імені Цімур, як параіў дзядуля, шукае ў адрыне чытво і знаходзіць цікавую кнігу «Цімур і яго каманда». Натхнёны аповесцю, ён вырашае незаўважна рабіць добрыя справы, гэта значыць, дапамагаць старым, і нават знаходзіць аднадумцаў — сваю «каманду». Тут аказваецца, што тэрыторыяй вёскі зацікавіліся сталічныя бізнесмены з мэтай пабудаваць санаторый. У сувязі з гэтым жыхары рызыкуюць адправіцца ў Дом састарэлых, а іх уласныя хаты будуць знішчаны. Дзеці, вядома, не застануцца ўбаку і возьмуцца вырашаць праблемы дарослых...

Аўтарам ідэі фільма з'яўляецца Дзяніс Бяспалы. Наталля Галуза стала рэжысёрам і, акрамя таго, удзельнічала ў напісанні сцэнарыя, заснаванага на аповесці Аркадзя Гайдара. Зрэшты, ад літаратурнай крыніцы ў фільме толькі каркасны матыў альтруістычнай дапамогі старэйшым, аповесць у чырвонай вокладцы і імя галоўнага героя.

Хочацца адразу зрабіць акцэнт на ўмовах стварэння фільма. Недастаткова сказаць — фільм малабюджэтны. Больш за тое: здымачная група працавала на добраахвотных пачатках. Дзіцячая кінашкола «Сінема», якая існуе пры кінакампаніі «Ілюзіён», і дзіцячая студыя з Украіны «Вясёлка» забяспечылі акцёрскі склад. Праца над фільмам стала толькі пляцоўкай для атрымання вопыту для дзяцей і здымачнай групы.

«Цімур і каманда» — прыклад фільма, калі гісторыя стварэння цікавейшая, чым сам праект: сюжэт карціны аказаўся заснаваным на штампах, труізме і, дарэчы, знаёмых беларускаму кінематографу матывах. Намер выкупіць «запаведную» зямлю пад прыбытковае будаўніцтва і выселіць жыхароў не так даўно прагучаў у фільме «Белыя росы. Вяртанне» (і, акрамя таго, яшчэ ў карцінах усяго свету, якіх, мабыць, мільён). У «Белых росах» гарадскія бізнесмены таксама як і ў «Цімуры...» актыўна супрацоўнічалі са старшынёй сельсавета, персанажам камічным і нікчэмным. У цэнтры фільма «Цудавостраў, або Палескія рабінзоны» (асучаснены сюжэт паводле аповесці Янкі Маўра), пару месяцаў таму прадстаўленага «Беларусьфільмам», — таксама дзеці, якія ў дзядулевай вёсцы вырашаюць дарослыя праблемы.

Недахоп сцэнарыя ў гэтым праекце — неарыгінальнае выкарыстанне штампаў, ад сюжэтастваральных да мімалётных. Кожны з галоўных герояў (іх чатыры) паралельна з высакародная дзейнасцю перажывае асабістую драму, абавязкова звязаную з сям'ёй. Бацькі Цімура празмерна занятыя працай і выжываннем у сучасным капіталістычным грамадстве; бацькі Каці (і яе малодшага брата Ягоркі) дзесьці за межамі кадра не могуць знайсці агульную мову і плануюць развесціся; Галя, якая жыве ў вёсцы, — сірата і рызыкуе застацца без хаты ў выніку ажыццяўлення амбіцыйных планаў бізнесменаў. Максім, якога маці з айчымам у выхаваўчых мэтах адправілі замест Італіі ў вёску, павінен будзе расчаравацца ў родным бацьку і прымірыцца з айчымам.

Увогуле ж, жаданне бескарысліва здымаць кіно, укладваць у яго чалавекалюбства і сацыяльны падтэкст, праца ў напружаных умовах з нявырашанымі фінансавымі пытаннямі, не проста выклікаюць павагу — захапляюць.

Нездарма стваральнікі фільма робяць акцэнт на тым, што ён не дзіцячы, а менавіта сямейны — дарослы чалавек павінен адчуць маўклівы дакор за падзенне інстытуту сям'і, задумацца і, можа быць, прыняць выклік. Аднак у фільме, які прэтэндуе на рэалістычнасць, некаторыя падзеі і персанажы не выклікаюць даверу. Напрыклад, непераканаўчай падаецца развязка канфлікту паміж бацькамі Каці. Цімур тэлефануе кожнаму з бацькоў сваёй сяброўкі з аднолькавым паведамленнем аб нібыта жахлівай немачы іх дачкі, з-за чаго кожны з іх зрываецца з закуліснага гарадскога месца і неадкладна едзе ў вёску. На пад'ездзе да Негарэлага бацька сустракае сваю жонку, машына якой захрасла на дарозе, ён просіць прабачэння (гледачу не паведамляецца, за што), канфлікт аказваецца вырашаным — падазрона проста і хутка.

Непераканаўчай здаецца дзіцячая афера з крадзяжом інфармацыі з камп'ютара сакратаркі старшыні сельсавета. Акрамя таго, непераканаўчае супрацьстаянне «каманды» Сяргею Колатаву. Бізнесмен (ён з'яўляецца яшчэ і бацькам Максіма) прыехаў у Негарэлае паказваць тэрыторыю для будаўніцтва двум інвестарам. Мудрагелісты план дзяцей напалохаць дзялкоў прывідамі і страшнай інфекцыяй у возеры павінен уздзейнічаць на двух інвестараў, якія «ўсё вырашаюць». Але яны настолькі безаблічныя, што здаюцца амаль лішнімі. Гэты эпізод становіцца супрацьстаяннем у першую чаргу бацьку Макса, персанаж якога павінен раскрыцца ў эпізодзе. Аднак супрацьстаянне гэта здаецца такім жа намінальным, як і два інвестары, якія згубіліся ў кадры. Сяргей Колатаў паспяхова паказвае сваё «я». Ад яго глядач не чакае нічога добрага пасля эпізоду з адкрыццём праўды дзядулем-бабуляй Максіму. Тут унук даведваецца аб даўніх падзеях: яго родны бацька калісьці прагнаў маці Максіма з дзіцем на руках на вуліцу. У адказ на гэтую інфармацыю ў гледача ўзнікае тысяча пытанняў. Сентыментальнае тлумачэнне «маці не расказвала табе, бо хацела, каб ты любіў свайго бацьку» гучыць непераканаўча. Нягледзячы на тое, што з фільма вынікае адназначная ацэнка ўчынку маці (такое высакароднае ўсёдараванне), хочацца сказаць: «Не веру».

У выніку па законах хэпі-энду сямейныя канфлікты аказваюцца вырашанымі: сям'я Каці ўз'ядналася, Галя застаецца жыць у вёсцы, Макс, з аднаго боку, расчароўваецца, а з іншага боку, знаходзіць бацьку ў асобе айчыма. Незавершанай засталася толькі лінія сям'і Цімура. Яго бацькі па-ранейшаму зарабляюць грошы, затое ён атрымаў пацалунак ад Каці.

На прэм'еры фільма ад стваральнікаў прагучала думка аб жаданні аднавіць цеплыню савецкага кіно, «па якім усе мы сумуем». Цеплыня і сардэчнасць льюцца ў фільме цераз край, як і ў многіх замежных несучасных або рускіх сучасных (і наадварот) карцінах, не прэтэндуючых на падабенства з савецкім кіно. Фільм больш нагадвае нам аб савецкім мінулым сваім антуражам. Можна пазнаць знаёмую ўсёй Беларусі (і не толькі) мэблю, узоры на покрывах, песню «Трава ля дома» гурта «Зямляне» і іншае.

Увогуле ж, жаданне бескарысліва здымаць кіно, укладваць у яго чалавекалюбства і сацыяльны падтэкст, праца ў напружаных умовах з нявырашанымі фінансавымі пытаннямі, не проста выклікаюць павагу — захапляюць. Можна спадзявацца, што карціна стане этапам, асновай для будучых прафесійных моцных работ. Факт з'яўлення фільма «Цімур і каманда» важны для нашай вузкай кінематаграфічнай прасторы.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

■ Выстава

ДА 35

Так называецца рэспубліканская маладзёжная выстава, якая будзе экспанавацца ў Палацы мастацтваў да 25 мая. На фоне грандыёзных мастацкіх праектаў, якія даюць уяўленне пра беларускае мастацтва ў гістарычным і сучасным зрэзе (маю на ўвазе найперш выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім музеі, а таксама ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва і ў выставачным комплексе на праспекце Пераможцаў, 14), гэтая экспазіцыя прапануе зазірнуць у будучыню. Большасць удзельнікаў — нядаўнія выпускнікі і сённяшнія студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. І, як сведчаць работы, яны ўжо сёння прафесіяналы высокага ўзроўню.

Вострасучасная, эксперыментальная графіка, алегарычны, з філасофскім падтэкстам жывапіс, гульня з пераасэнсаванымі прасторай і плоскасцю, нечакана прадстаўленыя арт-аб'екты і глыбокія паводле зашыфраванага ў іх сэнсу, выкананыя з самых розных матэрыялаў скульптурныя кампазіцыі... Гэта трэба бачыць. Гэтаму неабходна суадчуваць. Сёння, калі мы больш лёгка ўспрымаем візуальныя, а не вербальныя вобразы, менавіта выяўленчае мастацтва здатнае дапамагчы нам зразумець навакольны свет і саміх сябе. На выстаўцы можна пераканацца ў тым, што нашы маладыя мастакі малююць і пішуць партрэты, сцвярджаю з поўнай адказнасцю, больш цікавыя, чым заезджыя замежныя «зоркі». Яны здатныя перадаць таемную пульсацыю самой прыроды і складаныя філасофскія канцэпцыі.

Выстаўка атрымалася вельмі светлай, аптымістычнай, паўнагучнай. Кожны знойдзе творы, ля якіх хочацца спыніцца, заглыбіцца, зразумець ці хаця б паспрабаваць зразумець нешта вельмі сутнаснае. Творы здзіўляюць, інтрыгуюць, заварожваюць. Дзякуючы арганізатарам — і найперш секцыі маладых мастакоў і мастацтвазнаўцаў Беларускага саюза мастакоў — экспазіцыя пераконвае: абстрактныя мастацкія гульні, эфектнае штукарства застаюцца ў мінулым. Будучыню беларускага выяўленчага мастацтва вызначылі не мастацкія эксперыментальныя суполкі, а Асобы — такія, як філосаф, вобразатворца, народны мастак Беларусі, што доўгі час узначальваў кафедру манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка, прафесіянал з вялікай літары. На жаль, ён нядаўна пайшоў ад нас. Але ў Акадэміі сёння выкладаюць яго вучні. І яны, і сённяшнія студэнты працягваюць у мастацтве яго лінію, якая дапамагае зразумець ці хаця б задумацца над тым, хто мы ёсць у гэтым свеце.

Мяркую, што яшчэ адзін наш народны мастак, Уладзімір Тоўсцік, які сёння ўзначальвае кафедру малюнка, таксама можа ганарыцца сваімі вучнямі. Менавіта яго незвычайныя, паводле дакладна перададзенай духоўнай аўры кожнага героя, партрэты пісьменнікаў, мастакоў, нашых сучаснікаў міжволі згадала я пасля наведвання выстаўкі аднаго з самых «раскручаных», «дарагіх» медыйных мастакоў. Няўжо ізноў няма прарока ў сваёй Айчыне?

Хочаце адчуць, што такое жывое, пульсуючае святло сапраўднага мастацтва? Наведайце рэспубліканскую маладзёжную выставу, эпіграфам да якой для мяне асабіста сталі незвычайнае, аголенае да нерва скульптурнае «Сэрца» Алеся Сакалова і па-радзнаўску вострa эмацыянальная, пяшчотная (проста камок у горле!) скульптурная кампазіцыя аднаго з арганізатараў выстаўкі Івана Арцімовіча «Зімовае святло». Пакуль мы захапляемся, пакутуем, кахаем — мы жывыя.

Галіна БАГДАНАВА, мастацтвазнаўца, пісьменніца

■

■ Фестывалі

НАВОШТА ГАМЛЕТУ БЕНЗАПІЛА?

Сучаснае прачытанне класікі на фестывалі лялечных тэатраў

«Быць ці не быць?» — ужо не пытанне. Гэта выклік абставінам, з якімі можа справіцца толькі супергерой. Ён і выглядае як супергерой, які змагаецца са злом. І так падобны на герояў галівудскіх фільмаў, дзе ўсё вядома загадзя. Ды і пра Гамлета ж таксама вядома. Дзіўна тут адно: такім нечаканым яго паказалі ў спектаклі Магілёўскага абласнога тэатра лялек. Толькі лялек у звычайным разуменні вы не ўбачыце, хоць лялечных (несамастойных) персанажаў дастаткова, і пра гэта думаеш падчас прагляду. У сучаснага лялечнага тэатра ёсць чым здзіўляць.

Яны кранальныя і фантастычныя: кемлівыя, прыгожыя, крэатыўныя і захапляльныя. Жывыя — лялькі на сцэне. Ці людзі? Найперш людзі, а потым (можа быць) і лялькі. І хто ж тады галоўны ў гэтым тэатры? Кожны раз пра гэта думаеш: калі ёсць магчымасць паглядзець лялечныя тэатры з розных краін, якія прыязджаюць да нас на фестывалі. Нездарма міжнародных фестываляў лялечных тэатраў у Беларусі становіцца больш. Напрыклад, да мінскага сёлета яшчэ дадаліся «Лялькі над Нёманам» у Гродне. Нам ёсць чым ганарыцца ў гэтым відзе мастацтваў, і не толькі таму, што ёсць беларуская гістарычная традыцыя батлеек. Сучасны лялечны тэатр — гэта месца, дзе ўмеюць пераварнуць душу як дзіцяці, так і дарасламу (даўно трэба забыцца пра стэрэатып наконт публікі лялечных тэатраў — гэта сур'ёзнае і канцэптуальнае мастацтва!). І яны могуць агаломшыць нетрывіяльным асэнсаваннем вядомых твораў. І робяць гэта.

Нездарма 15 мая на адкрыцці VIII Мінскага міжнароднага фестывалю тэатраў лялек быў паказаны менавіта «Гамлет» Магілёўскага абласнога тэатра лялек. Але каб убачыць там лялек (асабліва, зразумець, калі і чаму яны з'яўляюцца сярод цалкам акцёрскага спектакля) — трэба добра падумаць. Рэжысёр Ігар Казакоў прыдумаў свайго Гамлета. Пры тым што артыст гаворыць словамі Шэкспіра. Але гэта Гамлет, які не столькі змагаецца з несправядлівасцю ў сям'і, для яго тое, што адбылося з бацькам, — праява сусветнага зла, ад якога ён імкнецца ўратаваць свет. Дастаткова паглядзець на гэтага героя — і ўсё зразумела. На нашых вачах шэкспіраўская трагедыя ператвараецца ў канцэптуальны постмадэрнісцкі спектакль, дзе ўсё прасякнута тонкай іроніяй і гумарам. І асабліва дапамагае гэтаму ўзаемадзеянне акцёраў з персанажамі-лялькамі (несамастойнымі героямі, якія залежаць ад волі іншых). Як можна смяяцца з Гамлета, такога драматычнага героя, які шукае праўду? Ды калі ласка: усё перавярнулася ў жыцці, герояў жа, здаецца, у ім няма наогул. Мастацтва проста рэагуе на жыццё, пераасэнсоўваючы класіку.

Сёлета ў праграме VIII Міжнароднага мінскага фестывалю тэатраў лялек шмат класічных пастановак. Шэкспіра наогул без слоў прывёз Беластоцкі тэатр лялек — яго спектакль мае назву «Мантэкі і Капулеці». Наш славуты (паводле трыумфу на апошняй Нацыянальнай тэатральнай прэміі) Гродзенскі абласны тэатр лялек таксама запрашае да дарослай размовы пра сур'ёзнае ў спектаклі «Фаўст. Сны» ў пастаноўцы Алега Жугжды. Наогул сёлета беларускія тэатры прыглядаюцца да сусветнай класікі: Гомельскі дзяржаўны тэатр лялек заклікае да пільнасці праз камедыю Мальера «Тарцюф (рэжысёр Георгій Гольман). А Брэсцкі тэатр лялек разважае пра тое, што ёсць зло для дзяржавы праз «Самазванцаў» паводле Пушкіна (у пастаноўцы А. Леляўскага). Але і айчыннай класіцы ёсць месца на сцэне: у пастаноўцы Аляксея Леляўскага, толькі ўжо ў яго родным Беларускім дзяржаўным тэатры лялек (Мінск) можна пабачыць «Ладдзю роспачы» паводле Уладзіміра Караткевіча.

Праграма насычаная: 14 спектакляў за 4 дні. Ёсць магчымасць паглядзець пастаноўкі з розных краін — Італіі, Ізраіля, Польшчы, Украіны, Расіі. Пастаноўкі на замежных мовах паказваюцца ў сінхронным перакладзе.

Асабліва гэта ацэняць гледачы, якія прыйдуць на прагляды з дзецьмі. Прычым ёсць спектаклі для самых маленькіх — пяцігадовых! Напрыклад, «Маленькі Маддэус» тэатра лялек «Агадзіт» (Ізраіль) пра Моцарта, «Ленка» Беластоцкага тэатра лялек, «Крылы Дзюймовачкі» Палтаўскага акадэмічнага абласнога тэатра лялек і іншыя. Каб мы не думалі, што айчынныя тэатры скіраваны толькі на сур'ёзныя пастаноўкі для дарослых: Мінскі абласны тэатр лялек «Батлейка» (з Маладзечна) прапануе жыццёвую гісторыю «Клачкі па закавулачках» паводле Георгія Остэра ў пастаноўцы Аляксандра Янушкевіча.

Жывыя эмоцыі. Жывыя пачуцці. Жывыя лялькі. Не, усё ж галоўныя тут людзі — акцёры, рэжысёры, мастакі. Яны ўмеюць ствараць цуды на сцэне. Уражваюць, агаломшваюць. Пераварочваюць душу. Ці не дзеля гэтага мы і ходзім у тэатр?

Ларыса ЦІМОШЫК, Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

■

■ Пытальнік

РАМОНТ ТЭЛЕФОНА СКОНЧЫЦЦА СУДОМ?

10 лютага я здаў свой тэлефон у сэрвісны цэнтр «Прадагруп» па вуліцы Сурганава. За 15 дзён яго там знаходжання нічога не было зроблена. Па маёй просьбе мне выдалі акт тэхнічнага агляду, што быццам бы ў маім тэлефоне патрабуецца замяніць плату. У той жа дзень я звярнуўся ў іншы сэрвіс, дзе цягам чатырох дзён была зроблена дыягностыка і праведзены рамонт...

Я.В. Галаўко, *г. Мінск.*

Ліст заяўніка мы прывялі ў скарочаным варыянце, апусціўшы тэхнічныя падрабязнасці. Сутнасць звароту спажыўца зводзілася да незадаволенасці працай работнікаў сэрвіснага цэнтра і патрабаваннем разабрацца ў сітуацыі, што склалася з рамонтам яго тэлефона. Па просьбе рэдакцыі ён быў разгледжаны ў адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска. Вось што нам паведамілі ў выніку ў афіцыйным рэагаванні.

«З прадстаўленых тлумачэнняў кіраўніка ТАА «Прадагруп» вынікае, што пры звароце 7.02.2014 у сэрвісны цэнтр у вашым тэлефоне было адноўлена праграмнае забеспячэнне з паніжэннем версіі. Пры гэтым тэрмін знаходжання ў рамонце склаў 5 дзён.

Пры паўторным звароце 10.02.2014 тэлефон быў накіраваны на тэсціраванне, падчас якога было высветлена, што праграмны рамонт дэфект не выправіў, з-за чаго патрабавалася замена асноўнай платы. Так, 20.02.2014 была заказана плата, у сувязі з чым ТАА «Прадагруп» павялічыла тэрмін рамонту на 30 дзён.

Разам з тым, згодна з п. 23 Правілаў выканання работ і аказання паслуг па рамонце канцавых абаненцкіх прылад, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28.03.2007 № 393, выканаўца абавязаны правесці рамонт у тэрмін, пазначаны ў дагаворы, які не можа перавышаць 14 дзён, а пры выяўленні схаваных дэфектаў тэрмін выканання заказу вызначаецца па ўзгадненні бакоў. Тэрмін правядзення дыягностыкі, які не патрабуе пацвярджэння арганізацыі-вытворцы, не павінен перавышаць трох рабочых дзён з дня афармлення дагавора.

У адпаведнасці з п.1 арт.30 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» (далей — Закон), пры парушэнні выканаўцам тэрмінаў выканання работы (аказання паслугі), асобных этапаў выканання работы (аказання паслугі), а таксама іншых тэрмінаў, прадугледжаных дагаворам, ці падчас выканання работы (аказання паслугі), калі стала відавочным, што яна не будзе выкананая ў тэрмін, спажывец мае права выбраць адзін з наступных варыянтаў.

Выканаўца абавязаны правесці рамонт у тэрмін, пазначаны ў дагаворы, які не можа перавышаць 14 дзён, а пры выяўленні схаваных дэфектаў тэрмін выканання заказу вызначаецца па ўзгадненні бакоў.

1. Прызначыць выканаўцу новы тэрмін.

2. Даручыць выкананне работы (аказанне паслугі) трэцім асобам за разумную цану ці выканаць яе сваімі сіламі і патрабаваць ад выканаўцы пакрыцця панесеных выдаткаў.

3. Патрабаваць суразмернага памяншэння вызначанай цаны за выкананне работы (аказанне паслугі).

4. Скасаваць дагавор аб выкананні работы (аказанні паслугі).

Спажывец таксама мае права патрабаваць поўнага пакрыцця страт, нанесеных яму ў сувязі з парушэннем тэрмінаў выканання работы (аказання паслугі).

Акрамя таго, арт. 31 Закона прадугледжвае, што пры выяўленні адступленняў ад умоў дагавора, якія пагоршылі вынік работ (паслугу), ці іншых недахопаў выкананай работы (аказання паслугі) спажывец мае права па сваім выбары патрабаваць выканання аднаго з наступных варыянтаў.

1. Бязвыплатнага выпраўлення недахопаў выкананай работы (аказанай паслугі).

2. Суразмернага змяншэння вызначанай цаны выкананай рабоце (аказанай паслузе).

3. Бязвыплатнага вырабу іншай рэчы з аднароднага матэрыялу такой жа якасці ці паўторнага выканання работы (аказання паслугі), калі гэта магчыма.

4. Пакрыцця панесеных ім выдаткаў па выпраўленні недахопаў выкананай работы (аказанай паслугі) сваімі сіламі ці трэцімі асобамі.

Таксама спажывец мае права патрабаваць поўнага пакрыцця выдаткаў, нанесеных яму ў сувязі з недахопамі выкананай работы (аказанай паслугі) і (ці) скасавання дагавора аб выкананні работы (аказанні паслугі) і вяртаннем заплачанай за выкананую работу (аказаную паслугу) грашовай сумы, і выплаты няўстойкі, калі адступленні ад умоў дагавора, якія пагоршылі вынік работы (паслугу), ці іншыя недахопы выкананай работы (аказанай паслугі) ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін не былі выпраўлены або з'яўляюцца істотнымі.

Такім чынам, паміж вамі і ТАА «Прадагруп» узнікла грамадзянска-прававая спрэчка, якая падлягае разгляду ў судзе. З мэтай вырашэння грамадзянска-прававой спрэчкі, якая склалася, вам неабходна звярнуцца ў суд ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Дадаткова інфармуем, што кіраўніку ТАА «Прадагруп» строга ўказана на неабходнасць захавання дзейнага заканадаўства, павышэння якасці і культуры абслугоўвання»

У адпаведнасці з арт. 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», вы маеце права абскардзіць рашэнне па вашым звароце ў Мінгарвыканкаме (г. Мінск, пр-т Незалежнасці, д. 8)».

■ Простая мова

МЫ Ў АДКАЗЕ...

Тралейбус ужо адходзіў, але ж, здавалася, калі падбегчы...

Паспела: у апошняе імгненне ўскочыла на прыступку, дзверы за спінай зачыніліся.

— Вы будзеце выходзіць? — тут жа пачула над вухам.

— Не, што вы, — адказала кабеце. І ўжо хацела прайсці ў салон — прапусціць яе да дзвярэй, але згледзела, што ззаду, за тралейбусам едзе аўтобус — якраз патрэбны.

— Прабачце... Выходжу, — запэўніла спадарожніцу.

І, вядома ж, выйшла б, калі б... не ўспомніла («з дзявочай памяці ў старэчы склероз — паступова і незаўважна»), што сёння ў мяне трохі іншы расклад, і таму цяпер еду не дамоў. Значыць, і аўтобус той без патрэбы: можна не выходзіць.

Карацей, адышлася-такі ад дзвярэй — з прабачэннямі прапусціла жанчыну да выхаду.

...Мужчына, пачуўшы (прычым цягам мінуты!) катэгарычнае «не, не выходжу», потым «выходжу» і зноў «не выходжу», мусіць, «па сценцы» пралез бы.

БЕЛАРУСКАЯ ПТУШКА БАЦЯН. ЁН ЖА — БУСЕЛ

У бальніцах пасля 17 усё ажывае: маладзейшыя цугам ідуць праведаць старэйшых...

Зрэшты, наадварот — здараецца таксама.

Дзядзька адзін да сына прыехаў, не без цяжкасцяў знайшоў палату, падсеў да ложка. Ну вядома ж, распытаў пра здароўе, пра дактароў, пра тое, як лечаць, чым кормяць, нешта сам распавёў. А там — слова за слова — да размоў далучыліся іншыя. Нехта з хворых, прынамсі, у дзядзькі спытаў: ну як там, на волі, ці прыйшла вясна, ці прыляцелі аисты?

— Не-е, ім рана яшчэ, — з веданнем справы закруціў галавою той. — *Аисты* ў дарозе пакуль. А вось буслы — буслы даўно прыляцелі. Гэта — наша птушачка, ранняя...

ЦЯЖКІ ВЫБАР...

На дачах дамок пры дамку і «соткі» пры «сотках»: як на далоні ўсё.

Адна з суседак (сталага веку, але ж спрытная, рухавая), прынамсі, пчолкай шчыруе — новую градку капае. Другая (маладая, мажная) — у шэзлонгу сядзіць, балдзее, гарбузікі лузгае і, мусіць жа, сумуе, бо той «пчолцы» крычыць:

— Сямёнаўна, вы б адпачылі крыху!.. Ідзіце я вас семкамі пачастую... А то ўсё капаеце ды садзіце... Сягоння што — цыбулю? Дык яе ж і на рынку можна купіць.

— Можна, — адстаўляе рыдлёўку суседка. — Але ж свая — смачнейшая, да таго ж без хіміі. Мы ўвосень гною прывезлі... А што папрацуем крыху, дык гэта ж на карысць. Ці паверыце, я тут на лецішчы два дні палётаю, патапчуся (то з рыдлёўкай, то з матыкай, то з граблямі-віламі), глядзіш — і на кіло пахудзею. А то і болей.

— Быць не можа! — насцярожваецца, не верыць вушам маладзіца і замаўкае (нават семкі болей не грызе!)... Падобна, лічыць, колькі кілаграмаў такім чынам можна скінуць? За месяц... Колькі за два? А за ўвесь сезон? Што — пад дваццаць?! Ды ёй за шчасце б і пяць! Але ж...

Каб жа не ўставаць з шэзлонга, каб жа не капаць!..

ПА ЗУБАХ!

Дзень. Метро — сесці няма дзе. А зрэшты, не вельмі і хацелася: пару-тройку станцый можна праехаць стоячы, а тым больш у такім суседстве... Мужчына непадалёк — проста вачэй не адвесці, бо прыгожы амаль па-чэхаўску: і тварам, і адзеннем, і...

Наконт душы і думак, праўда, сумненні. Бо той харашун, адчуўшы ўвагу, нос аж да столі задраў. І тым самым «сказаў», што калі трымаць сябе ў форме (ну вось як ён), то застанешся цікавым і ў сталым веку... Нават для дзяўчат...

Адна з іх (і тут жа!) гэта «засведчыла». Нясмела ўстала з месца: маўляў, сядайце, калі ласка...

Чалавеку як рандэлькам па зубах... Не кажучы ўжо пра іншае.

«ЗАІ» — БЫЛІ...

Універсам, чарга. У маладзічкі, што стаіць наперадзе, салаўём заліваецца мабільнік.

— О, козлік! Ну нарэшце! — радуецца яна некаму, расказвае, што цяпер у краме, пералічвае, што купіла, пытаецца, можа, ён чаго хоча...

Карацей, размова як размова ў іх — можна сказаць, звычная, калі б праз сказ-другі не гучала гэтае «чуеш, козлік», «добра, козлік»...

«Коцікі» — былі, прычым колькі заўгодна! «Заі» і «зайкі» — таксама. Не дзіва — «сонейкі» і «ластаўкі», нават «вожыкі»!

«Козлік» — гэта нешта новае.

І, як высвятляецца, зусім не крыўднае — калі з любых вуснаў.

ТОСТ ЯК ФАКТ... І КАМЕНТАРЫЙ

Статыстыка ведае ўсё і час ад часу здзіўляе: напрыклад, для васьмі нашых жыхароў гэтая вясна 110-й стала! Жывуць жа людзі: гэткія даты спраўляюць!..

З нагоды. Адна з доўгажыхарак гасцей сабрала: дзяцей, нявестак-зяцёў, унукаў, праўнукаў... Застолле — люба паглядзець! І грэх жа не выпіць — як сказаў адзін з сыноў, за матульку, за яе шаноўны ўзрост, за здароўе! За тое, каб і налета прычакаць — каб яна запрасіла...

Імянінніца, вядома ж, рада была: яна сваю чарыцу з ахвотай да вуснаў прыклала. А вось адна з нявестак (якая, да слова, усё жыццё з ёй пражыла) — не стрымалася. Сказала гасцям:

— Вы сабе як хочаце, а я за гэта піць не буду...

НАПІСАНАМУ ВЕРЫЦЬ?

Вёска, вуліца, дыхтоўны дом, а ўжо плот перад ім...

Надпіс на брамцы: «Асцярожна! У двары злы сабака». І трэба ж — пыса яго якраз пад «шыльдай» — між штыкецін...

Мелі шчасце паглядзець. Нават больш за тое — пагладзіць! Добры сабачка! І, відаць па ўсім, разумны-разумны.

Значыць, няпраўда на той брамцы напісана?

...І каб толькі там, пра сабаку.

ДАРАГОЕ ЯЕЧКА ДА ВЯЛІКАДНЯ

«Чытанне — працэс інтымны», — сцвярджае сяброўка. Хоць магла б не сцвярджаць: яно і так зразумела, бо ў яе для кніг спецыяльная падстаўка, настольная лямпа, утульнае крэсла з падлакотнікамі... У мяне, як правіла, лямпачка ў аўтобусе. Што, як быццам, добра: можна болей паспець. І, вядома ж, дрэнна, бо многіх з аўтараў проста нельга чытаць урыўкамі. Апроч таго, захапіўшыся, можна праехаць свой прыпынак, можна шмат чаго не пачуць, не ўбачыць (напрыклад, адкуль побач з аўтавакзалам «Усходні» з'явіўся HOTEL?)... А што горш за тое — можна ў краму з кніжкай зайсці і... без кніжкі выйсці.

Галоўнае, тут жа спахапіцца, вярнуцца, на самым бачным месцы павесіць «пераканаўчую просьбу»: за ўзнагароджанне (вялікае!) вярнуць забытую на гэтым століку кнігу Святланы Алексіевіч «Час сэканд-хэнд»...

Два тыдні паперка вісела, два тыдні ліпела надзея, што кнігу — недачытаную, цікавую — нехта аддасць.

Ага... Чакай Пятра... Што спачатку вельмі засмучала! А потым, з часам, якраз наадварот — стала радаваць, бо гэта ж, згадзіцеся, добра, што не аддаюць кніжкі. Нават за грошы. Бо яны — даражэйшыя.

АРТЫСТ

Жабракі ёсць ва ўсіх сталіцах Еўропы — Мінск не выключэнне.

Ля вось гэтага, на выхадзе з метро, крок замаруджвалі многія. Можа, таму, што дзед быў чысценькі, у крук сагнуты і, відавочна, непітушчы. Можа, таму, што сваю белую шапку ён трымаў дрыжачай рукой і тым самым проста вымушаў хоць нешта ў яе пакласці. «На зваротным шляху», — вырашылі з сяброўкай. І нават загадзя падрыхтавалі грошы. А калі вярталіся...

Здалёку бачылі — той бядак стаіць на ранейшым месцы. А сталі падыходзіць (мы — з аднаго боку, міліцэйскі патруль, да слова, — з другога), і дзеда як падмянілі: ён умомант разагнуўся, расправіў плечы, лысіну схаваў пад белай шапачкай і так борздзенька пайшоў на выхад, што... не дагналі.

МОЖА...

Радаўніца — Вялікдзень для мёртвых, а збірае жывых ля родных магіл. Збірае сем'ямі, купкамі, збірае гучным плачам і ціхімі застоллямі, пасля якіх ля крыжоў ды помнікаў застаюцца поўныя чаркі, фарбаваныя яйкі, цукеркі і, вядома ж, кветкі...

Найпрыгажэйшыя, найдаражэйшыя (яшчэ і па кошце) — на магілах моладзі...

Не без таго — некага з іх «скасіла» хвароба. Усе ж астатнія (на помніках так і пазначана) трагічна загінулі, загінулі без вайны. Нехта — з-за лішніх ста грамаў і 100 кіламетраў (там, дзе замнога і 70), нехта — з-за спадзеваў на «авось праскочу» і «авось пранясе», нехта — з-за наркотыкаў ці ўласнай дураты, з-за жадання нешта даказаць — смерцю (?!), з-за...

На Радаўніцу шмат народу на могілках: пераважна людзей дарослых. Дзяцей — хіба трохі, малых. А не лішне было б прыводзіць падрослых... Хай бы пахадзілі тут, паміж магіл, на помніках пабачылі твары сваіх аднагодкаў, пачыталі даты жыцця, пачулі, як плачуць бацькі... Можа, хоць трохі думалі б?

І, можа, хоць да некага дайшло б тады, што Бог і сапраўды сцеражэ — але тых, хто сцеражэцца сам.

МЫ Ў АДКАЗЕ...

«Увага! Увага! Увага!»

Зрэшты, не, саміх гэтых слоў у аб'яве не было. Яны проста чыталіся: чыталіся, перадусім, паміж радкоў, бо прапаў чалавек: ноччу, а палове першай, выйшаў з рэстарана — і знік...

Паведамляўся рост яго, колер валасоў, адзення, абутку... А напрыканцы гучала ўмольнае — да ўсіх, хто хоць нешта бачыў, хто хоць нешта чуў, хто валодае хоць нейкай інфармацыяй — пазваніць, паведаміць, дапамагчы адшукаць... Яшчэ і таму, што гэтага зніклага вельмі чакаюць жонка і маленькае дзіця...

А яшчэ, відавочна, бацькі, бабулі-дзяды, іншая радня, сябры і суседзі, супрацоўнікі — людзі, якія любяць яго...

І ён іх, ну напэўна ж, таксама?

Тады... навошта быў гэты рэстаран — у іншым горадзе, ноч-апоўнач — навошта былі пошукі прыгод?

...У сваячкі з першых дзён сямейнага жыцця на халадзільніку красаваўся кароткі надпіс: «Мы ў адказе за тых, каго прыручылі».

Каб пастаянна бачыць, каб помніць, як імя сваё: «Мы ў адказе...»

Валянціна ДОЎНАР

■

ПАМЯЦЬ ПРА ЛЁТЧЫКА ЖЫВЕ

Фота БЕЛТА.

Пошук абломкаў самалёта капітана Віктара Дашкіна (яго Су-9 пацярпеў аварыю ў 1964 годзе) ідзе ў Крычаве. Пошукавыя работы вядуцца вадалазамі Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС на возеры Маладзёжнае каля прадпрыемства «Крычаўцэментшыфер». Гэтае возера створана шляхам затаплення мелавога кар'ера. Ускладніць пошукі можа вялікая глыбіня вадаёма, якая дасягае 57 м, і мяккія глеістыя адклады на яго дне. Лётчык Віктар Дашкін 4 чэрвеня 1964 накіраваў самалёт Су-9, які пацярпеў аварыю, у адпрацаваны кар'ер і цаной свайго жыцця выратаваў горад.

■ Факт

Пінжак з градуснікам

Такія незвычайныя школьныя касцюмы пачало выпускаць бабруйскае прадпрыемства «Славянка». Пластыкавыя тэрмометры, выробленыя замежнымі вытворцамі па сучасных тэхналогіях, ушываюцца ў падкладачную тканіну.

Па тым, як мяняе фарбу гэтае прыстасаванне, можна будзе вызначыць стан здароўя падлетка. І нават пракантраляваць, расшпілены быў пінжак, калі ён бег па вуліцы, ці не. Цікава, што пакуль такую вопратку навучэнцам яшчэ ніхто ў свеце не прапаноўваў. Градуснікамі забяспечваліся толькі касцюмы для альпіністаў.

— Мы імкнёмся, каб адзенне, у якім падлетак праводзіць значную частку свайго часу, было максімальна камфортным і зручным, — паведаміў **дырэктар прадпрыемства Тэймураз БАЧАРАШВІЛІ.** — Пры гэтым працуем па новым стандарце краін Мытнага саюза, які гарантуе выкарыстанне бяспечных для здароўя матэрыялаў і захаванне адпаведных тэхналогій сучаснага ўзроўню.

Навінка паступіць у продаж ужо ў наступным месяцы, за кошт «наваротаў» адзенне будзе каштаваць ў сярэднім на 30 тысяч рублёў больш. Дарэчы, пінжакі з градуснікамі — не адзіная цікавінка бабруйскіх вытворцаў. Сярод мадэляў VIP-лініі ёсць касцюмы з кішэнямі для мабільных тэлефонаў, якія не прапускаюць шкоднае выпраменьванне.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Свет без вайны

«ДОБРА, КАЛІ НА ВУЛІЦАХ НЕ СТРАЛЯЮЦЬ»

Магілёў для сірыйскага студэнта стаў другім домам

«Слухай мяне сюды», — нечакана выдае ён на беларускай мове, і вочы яго смяюцца. Гэтую прыказку Малек пачуў ад адной вясковай бабулькі, якая паўтарала яе, здаецца, бясконца. А яшчэ ён добра ведае беларускія назвы магілёўскіх прыпынкаў, якія абвяшчаюць у гарадскім транспарце. «Мне падабаецца ваша мова, — усміхаецца ён. — Яна вельмі прыгожая і незвычайная». З захапленнем расказвае пра Полацк, дзе паспеў пабываць. А яшчэ пра Мінск і Віцебск. Да іншых гарадоў ён пакуль не даехаў, але цікавасць ёсць...

У Магілёве Малек Фахер Аддзін жыве ўжо 2 гады. І тое, што тут спакойна і не страляюць, як на яго радзіме ў Сірыі, ён шануе больш за ўсё...

ЗДОЛЕЎ УРАЗІЦЬ ВЫКЛАДЧЫКА

Яго родны горад Латакія — вядомы курорт на ўзбярэжжы Міжземнага мора, дзе сонца свеціць амаль круглы год, а апельсіны і мандарыны растуць на кожным кроку. Гэты абласканы морам і цёплымі вятрамі край часта сніцца яму па начах...

У Магілёў яго паклікаў стрыечны брат, які скончыў тут Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, ажаніўся і нават заняўся бізнесам. Ад яго Малек даведаўся, што тут жывуць ветлівыя людзі і няма міжнацыянальных канфліктаў. А яшчэ ён расказаў, што ў Магілёве ёсць добрыя ўмовы для вучобы і нават дапамог са студэнцкім запрашэннем.

Зараз Малек вучыцца на другім курсе электратэхнічнага факультэта БРУ. У сябе на радзіме яшчэ да службы ў арміі ён паспеў скончыць 3 курсы ўніверсітэта на матэматычным факультэце, і гэтыя веды яму тут вельмі спатрэбіліся. А вось размаўляць па-руску навучыўся толькі ў Магілёве. Таму з гуманітарнымі прадметамі, прызнаецца, ёсць складанасці. Успамінае, што на першым курсе да заліку па гісторыі Беларусі рыхтаваўся па... інтэрнэтаўскай Вікіпедыі, дзе адна і тая ж інфармацыя даецца на розных мовах. Сваім адказам на пытанне пра Хатынь уразіў нават выкладчыка. Той не чакаў ад іншаземца такіх ведаў. Пра Другую сусветную вайну Малек шмат чаго чытаў і добра ведае, колькі гора яна прынесла чалавецтву і колькі людскіх ахвяр прынесла на яе алтар. Што такое вайна, ён уяўляе не толькі па кніжках. Але пра баявыя дзеянні ў Сірыі адмаўляецца гаварыць. Галоўнае, што родныя — маці, сястра, пляменнікі — жывыя.

ПРЫХІЛЬНІК БЕЛАРУСКАЙ КУХНІ

Малек прызнаецца, што жыццё ў Беларусі зрабіла яго больш цярплівым і спакойным. Цяжка толькі было прызвычайвацца да клімату. Калі ўпершыню прыляцеў у Беларусь, нават з самалёта баяўся выходзіць: на вуліцы было ўсяго плюс 4 (у Сірыі на той момант тэмпература дасягала 34 градусаў цяпла). Гэта цяпер Малек паспеў прывыкнуць і да снегу, якога на яго радзіме амаль няма, і да маразоў. Сёлета і наогул зіма здалася яму вельмі кароткай — не паспеў як след яе пафатаграфаваць. Гэтай справай ён захапіўся таксама ў Беларусі. Летась нават купіў веласіпед, каб лягчэй было займацца «фотапаляваннем». З задавальненнем дэманструе здымкі, якія выкладвае ў сацыяльных сетках. Іх і насамрэч шмат: Пячэрскі лесапарк, мост з відам на вуліцу Фаціна, застылае ў снезе дрэва — мясцовыя краявіды вельмі маляўнічыя. Хаця і прызнаецца, што здзівіць чымсьці жыхара Сірыі, дзе ёсць усё — мора, горы, рэкі, азёры, нават пустыня, вельмі цяжка. А яшчэ яму падабаюцца жывёлы. Два гады таму яму падарылі маленькае кацяня, якое ён назваў Мунай. Цяпер Муна — сапраўдная прыгажуня.

Трапляе на вочы здымак, дзе Малек са стрыечным братам сядзяць на трактары: дапамагаў яго беларускай радне капаць бульбу. «Ну і як?» — пытаюся са спачуваннем. Ён бадзёра ўсміхаецца: «Цікава!»

У Магілёў яго паклікаў стрыечны брат, які скончыў тут Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, ажаніўся і нават заняўся бізнесам.

За тыя два гады, што жыве ў Магілёве, ён стаў сапраўдным прыхільнікам беларускай кухні. Даспадобы прыйшліся баршчы, дранікі, катлеты, гуляш, якія гатуе яго кватэрная гаспадыня. Калі ёсць настрой, ён і сам кухарыць: навучыўся гэтай справе, калі служыў у арміі. Ёсць у яго нават свой сакрэт засолкі агуркоў: яны больш смачныя, калі не дабаўляць у расол цукар.

СВЕТ НЕ ДЛЯ ВАЙНЫ

А вось галоўная розніца паміж сірыйцам і беларусам праяўляецца ў адносінах да сям'і, лічыць Малек. На яго радзіме паміж сваякамі існуюць больш цесныя сувязі. Калі нешта здарылася, усе дапамагаюць адно аднаму. Дзеці ва ўсім падпарадкоўваюцца бацькам і ніколі ім не пярэчаць. Нават калі збіраюцца ўступіць у шлюб, а бацька і маці не далі на тое згоды, рэдка ідуць насуперак: ім не дазваляюць гэта рабіць рэлігія і выхаванне. Як вынік — вельмі нізкі паказчык разводаў у краіне.

— А якія планы на будучыню? — цікаўлюся ў Малека напрыканцы размовы.

— Пакуль я студэнт, а там паглядзім, — паціскае ён плячыма. — Хацелася б вярнуцца на радзіму. Толькі хто цяпер ведае, як праз некалькі гадоў складзецца мой лёс?

Падчас развітання суразмоўца прызнаецца, што не прапускае ніводнага беларускага свята. І з вялікай павагай ставіцца да Дня Перамогі. У гэты дзень ён бярэ свой фотаапарат і абыходзіць увесь горад, каб «злавіць» тыя хвалюючыя кадры, дзе праз 70 гадоў пасля вайны сівавалосы ветэран змахвае са шчакі слязу, а маленькія дзеці кранальна працягваюць старому сціплы букет рамонкаў. Гэтыя здымкі ён абавязкова пашле на радзіму. Каб яшчэ раз нагадаць: наш свет створаны не для вайны.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Дзённік настаўніка

ЖЫЛІ-БЫЛІ ДЗЕД ДЫ БАБА...

Дзеці любяць казкі. І народныя, і аўтарскія, але...

Гэтыя казкі павінны мець шчаслівы фінал. Дабро перамагае зло, прычым менавіта перамагае, а не забівае (тым больш з нейкай садысцкай жорсткасцю).

Дзіцячыя пісьменнікі, ствараючы казачныя гісторыі, добра гэта разумеюць (казкі Андэрсана не лічацца, бо пісаліся зусім не для дзіцячай аўдыторыі) і стараюцца прытрымлівацца такіх вось агульнапрынятых нормаў.

Гэта што датычыцца аўтарскіх казак. А вось з казкамі народнымі сітуацыя крыху іншая...

Жорсткасці і гвалту там значна больш. Узяць хаця б усім нам вядомую казку пра калабка. Якое тут можа быць шчаслівае заканчэнне, калі калабка лісіца-хітрыца проста з'ела?!

Некаторыя даследчыкі казак спрабуюць тлумачыць гэта тым, што ў гэтай казцы проста закладзены глыбокі маральны сэнс: маўляў, уцёк гэты непаслухмяны Калабок ад бабулі і дзядулі — і вось вам вынік! А не ўцякаў бы, тады...

І што б тады? Жыў бы калабок у дзядулі з бабуляй прыпяваючы? Ці ўсё ж з'елі б яны яго, бо толькі для гэтага і спяклі?

Але казка пра калабка — гэта яшчэ «кветачкі» ў параўнанні з многімі іншымі народнымі казкамі! Праўда, тут трэба дадаць яшчэ фразу: «у іх першапачатковым гучанні»...

Бо тыя пісьменнікі альбо вучоныя-фалькларысты, што збіралі і запісвалі гэтыя народныя казкі, спрабавалі хоць нейкім чынам змякчыць іх жорсткасць, добра разумеючы, якія казкі і з якім заканчэннем могуць быць запатрабаваныя дзецьмі.

Узяць, напрыклад, казку «Каза-дзераза». Там каза хлусліва жаліцца дзеду на яго дачок і жонку, а дзед, паверыўшы ёй, сварыцца на жонку і дачок, нават б'е іх...

А вось у першапачатковым варыянце казкі дзед іх папросту... забівае! І закопвае за печкай, што даказвае глыбокую старажытнасць гэтай казкі, бо быў такі гістарычны перыяд, калі нябожчыкаў нашы продкі (яшчэ індаеўрапейцы нават, а не славяне) хавалі менавіта за печкай (альбо пад печкай).

Занадта жорстка для казкі, скажаце вы. Жорстка, згодзен! Але ж і час, у які стваралася гэтая казка, быў не менш жорсткім і крывавым, і ні пра якую міласэрнасць тады і размовы нават не ішло.

Ці вось іншая народная казка «Тры мядзведзі». Памятаеце, як дзяўчынка заблукала ў лесе, трапіла ў дом, у якім жылі мядзведзі, пасядзела за іх сталом, паела з іх талерак, павалялася ў іх ложках. А потым, калі мядзведзі вярнуліся — здолела выскачыць у акно і ўцячы. І мядзведзі яе не дагналі.

Неяк ненатуральна гучыць, прызнайцеся. Каб мядзведзь не дагнаў маленькую дзяўчынку, ды яшчэ ў такім знаёмым лесе? Адразу ж прыходзіць у галаву думка, што такі шчаслівы канец «прыставілі» да казкі штучна. І гэта сапраўды так. У першапачатковым варыянце дзяўчынка, на жаль, не змагла ўцячы. Злавілі яе мядзведзі і з'елі, каб не лезла больш абы-куды. Але ж не будзеш сучасным дзецям расказваць казку з такім вось жудасным заканчэннем...

Калі ж паглядзець на казкі заходнееўрапейскія — там тая ж гісторыя. Шарль Перо альбо браты Грым, збіраючы і апрацоўваючы французскія і нямецкія народныя казкі, стараліся хоць нейкім чынам змякчыць жорсткія, нават крывавыя іх сюжэты. Праўда, цалкам пазбавіцца ад усяго гэтага так і не змаглі.

Успомнім хаця б усім вядомую казку пра Чырвоны Каптурок. Там воўк глытае спярша бабулю, а потым і ўнучку. І толькі ўмяшанне дрывасека (варыянт — паляўнічага) іх выратоўвае. Але, заўважце, адбываецца гэта пасля таго ўжо, як воўк іх праглынуў, так што жорсткасці хапае нават у «прыгладжаным» варыянце народнай казкі.

А вось у першапачатковым варыянце заканчэнне было яшчэ больш сумным. Там воўк бабулю не глытае жыўцом, а проста... забівае. А потым яшчэ і гатуе з яе нейкую страву і корміць гэтай стравай дзяўчынку-ўнучку (мянушку Чырвоны Каптурок ёй яшчэ не прыдумалі). Котку, якая спрабуе яе папярэдзіць, воўк таксама забівае — драўляным чаравікам. А потым з'ядае няшчаснае дзяўчо і... усё! Казка на гэтым завяршаецца! І ніякіх табе дрывасекаў, паляўнічых, ніякага шчаслівага выратавання...

Ці ўзяць казку пра Папялушку. Добрая ласкавая дзяўчынка церпіць ад злой мачыхі і яе не менш злых дачок. Яны нават прынца дураць, дарэмна спрабуючы насунуць на нагу хрустальны туфлік...

Толькі вось у першапачатковым варыянце казкі адна з іх пры гэтым вымушана была адрэзаць сабе палец, а другая — пятку. Балюча, напэўна, было... А потым ім яшчэ і выдзёўбваюць вочы птушкі, што дапамагаюць Папялушцы. Так што фінал казкі злыя сёстры пакідаюць сляпымі і кульгавымі жабрачкамі, а «добрая і ласкавая» Папялушка літаральна купаецца ў раскошы і нават не ўспамінае аб гэтых сваіх, якіх-ніякіх, а родзічах...

Навошта я пра ўсё гэта вам распавядаю? Магчыма, для таго толькі, каб нагадаць, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці сучаснага свету, жорсткасці ў ім стала ўсё ж значна менш, чым было, скажам, яшчэ некалькі стагоддзяў таму. Нават казкі сучасныя куды больш гуманныя ў параўнанні з тымі, даўнейшымі...

Генадзь АЎЛАСЕНКА

■

ВАЖНА ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ ПА СТАНДАРТАХ

Карэспандэнты «Звязды» гутараць з дырэктарам Слуцкага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Ірынай ЯКУТА

Атэстат за нумарам два

— Ваш калектыў, Ірына Генадзьеўна, у пэўным сэнсе ўнікальны. Успомнім напачатку такі факт: лабараторыя па выпрабаванні харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі ў савецкія часы атрымлівала атэстат акрэдытацыі адной з самых першых у рэспубліцы.

— Менавіта так. Выпрабавальная лабараторыя функцыянуе з 1979 года, і на момант свайго стварэння была другой акрэдытаванай у Беларусі. Мы першымі, напрыклад, асвойвалі выпрабаванні кармоў, бо ў тым адчувалася максімальная патрэба для гаспадарак зоны, якую курыруем. А гэта Слуцкі, Салігорскі, Нясвіжскі, Старадарожскі, Любанскі, Клецкі, Капыльскі і Уздзенскі раёны.

Аддзел, створаны на базе выпрабавальнай лабараторыі, налічвае сёння 15 чалавек, і асноўныя напрамкі яго дзейнасці — фізіка-хімічныя, мікрабіялагічныя, радыялагічныя выпрабаванні, выпрабаванні па паказчыках бяспекі. Варта падкрэсліць, што сёння вялікі спектр выпрабаванняў праводзіцца на адпаведнасць еўрапейскім і міжнародным патрабаванням і Адзіным патрабаванням Мытнага саюза. А калі больш дакладна, то выпрабаванні малочнай, маслатлушчавай, мясной, кансервавай прадукцыі, а таксама спецый, камбікармоў, вады пітной, крухмалу па паказчыках якасці і бяспечнасці праводзяцца больш чым па 30 еўрапейскіх (EN) і міжнародных (ISO) метадах.

Выпрабавальная база аддзела пастаянна абнаўляецца, удасканальваецца і папаўняецца. Яшчэ і таму, што наменклатура выпрабаванняў прадукцыі пастаянна пашыраецца, цяпер у наменклатуру акрэдытацыі аддзела ўваходзіць больш за 60 груп тых ці іншай прадукцыі. На працягу 2012 і 2013 гадоў праводзіліся работы па асваенні і ўкараненні методык выпрабаванняў з наступнай акрэдытацыяй па цэлым блоку харчовых рэгламентаў, што ўводзяцца ў Мытным саюзе. Скажам, толькі ў 2013 годзе вобласць акрэдытацыі актуалізавана на права правядзення выпрабаванняў на адпаведнасць патрабаванням наступных тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (ТР МС): ТР МС 015/2011 «Аб бяспечнасці збожжа», ТР МС 021/2011 «Аб бяспечнасці харчовай прадукцыі», ТР МС 023/2011 «Тэхнічны рэгламент на сокавую прадукцыю з садавіны і агародніны», ТР МС 024/2011 «Тэхнічны рэгламент на маслатлушчавую прадукцыю». У 2014 годзе праведзена актуалізацыя вобласці акрэдытацыі на работы па выпрабаваннях на адпаведнасць патрабаванням ТР МС аб бяспечнасці мяса і мясной прадукцыі, а таксама бяспечнасці малака і малочнай прадукцыі.

У мінулым годзе з суб'ектамі гаспадарчай дзейнасці заключана больш за 90 гадавых дагавораў на правядзенне выпрабаванняў у адпаведнасці са схемамі тэхнахімкантролю. Выпрабавана 6059 узораў прадукцыі, праведзены 74163 выпрабаванні.

Таксама з 2014 года спецыялісты аддзела праводзяць работы па ацэнцы і праверцы якасці выканання вымярэнняў падраздзяленнямі радыяцыйнага кантролю суб'ектаў гаспадарання.

— Мы ведаем, што патрабаванні да ўзроўню і якасці работы выпрабавальных лабараторый вызначаюцца цэлым шэрагам дакументаў...

— Асноўным з'яўляецца СТБ ISO/МЭК 17025. Акрамя гэтага стандарту, у сферы міжнародных патрабаванняў да выпрабаванняў прадукцыі дзейнічаюць дырэктывы, пагадненні і рэгламенты, гэта значыць, пытанням аб'ектыўнасці атрыманых вынікаў выпрабаванняў ва ўсім свеце надаецца вялікая ўвага. Што звязана з неабходнасцю забеспячэння якасці і супастаўнасці вынікаў выпрабаванняў, атрыманых у розных лабараторыях.

У аддзеле прымяняюцца ўсе спосабы кантролю дакладнасці і правільнасці вынікаў работ, што выконваюцца (з стандартнымі і рэферэнснымі ўзорамі, удзел у міжлабараторных параўнальных выпрабаваннях, выкарыстанне кантрольных карт і ўнутрылабараторны статыстычны кантроль для

Прадстаўляем суразмоўцу

Ірына Якута родам са Слуцка. Яе бацькі працавалі ў сістэме Дзяржстандарту з першага дня арганізацыі мясцовага тэрытарыяльнага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі і змаглі прывіць дачцы любоў да гэтай нялёгкай, але цікавай прафесіі.

За плячыма і самой Ірыны Генадзьеўны ні многа ні мала — 16 гадоў работы ў цэнтры, дзе пачынала радавым спецыялістам. Мае вышэйшую юрыдычную адукацыю. У 2013 годзе скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Калектыў узначальвае з 2010 года.

ацэнкі прамежкавай прэцызійнасці (унутрылабараторнай узнаўляльнасці) і гэтак далей).

Важная роля ў аддзеле адводзіцца кіраванню персаналам, павышэнню яго граматнасці. Праводзіцца пастаяннае навучанне супрацоўнікаў праз тэматычныя тэхнічныя вучобы, курсы павышэння кваліфікацыі як непасрэдна па правядзенні выпрабаванняў, так і па валідацыі метадаў, што прымяняюцца пры ажыццяўленні выпрабаванняў; удзел у рабоце навучальных семінараў, у тым ліку тых, якія арганізуюцца прадстаўнікамі ЕС.

З мэтай прафесійна-тэхнічнага росту робіцца стаўка на маладых ініцыятыўных спецыялістаў. Пры гэтым мы не адмаўляемся ад вопыту ветэранаў цэнтра і ад перайманасці пакаленняў. У выніку дасягненне пастаўленых перад аддзелам мэт і задач дазваляе пастаянна ўдасканальваць якасць паслуг, дабівацца адпаведнасці міжнародным нормам і патрабаванням. Вядучыя спецыялісты аддзела прыцягваюцца ў якасці тэхнічных экспертаў пры ацэнцы тэхнічнай кампетэнтнасці выпрабавальных лабараторый, якую праводзіць Беларускі дзяржаўны цэнтр акрэдытацыі (БГЦА).

Адзіны ў сістэме

— Нам здалося цікавым яшчэ і тое, што ў вас — адзіны ў сістэме аддзел па выпрабаванні мэблі і вырабаў дрэваапрацоўкі.

— Гэта таксама адметнасць цэнтра. З развіццём нацыянальнай сістэмы пацвярджэння адпаведнасці і ўвядзеннем у канцы 90-х абавязковай сертыфікацыі мэблі ў краіне з'яўляецца вострая неабходнасць правядзення работ па выпрабаваннях гэтага віду прадукцыі. Але перш чым у 1998 годзе ў ЦСМС з'явіўся аддзел выпрабаванняў мэблі і вырабаў дрэваапрацоўкі, быў пройдзены няпросты і нялёгкі шлях яго стварэння. Спатрэбіліся час і немалыя намаганні для распрацоўкі сваімі сіламі дзяржаўных стандартаў, набыцця дарагога выпрабавальнага абсталявання, падбору спецыялістаў. І на той час, і сёння гэты аддзел — адзіны ў сістэме Дзяржстандарту. Як і ўсе асноўныя кірункі, так і гэтая лабараторыя была створана па ініцыятыве Генадзя Якаўлевіча Загарэя, які з'яўляўся нязменным кіраўніком цэнтра на працягу амаль 40 гадоў.

У пачатку працоўнай біяграфіі аддзела ў яго штаце налічваліся толькі тры супрацоўнікі і праводзіліся выпрабаванні па фізіка-механічных паказчыках толькі мэблі. З цягам часу колькасць супрацоўнікаў павялічылася да 11 чалавек. І з улікам узросłых запатрабаванняў і ў інтарэсах, у першую чаргу, айчынных вытворцаў, а таксама па меры ўзмацнення нарматыўных патрабаванняў да мэблевай прадукцыі, увядзення новых кантралюемых параметраў, пашыралася і наменклатура паказчыкаў, якія выпрабоўваюцца. Як непасрэдна па мэблі, так і па ахоўных дэкаратыўных пакрыццях, па фурнітуры, піла- і лесаматэрыялах, плітных драўнінных матэрыялах (ДСП, ДВП). Асвоены выпрабаванні дэталяў профільных з драўніны для будаўніцтва, ненаполістырольных пліт, вокнаў і дзвярэй, дэталяў клееных, тары вытворчай, драўнянай, з гофракардону, драўняных паддонаў рознага прызначэння і іншай прадукцыі.

З 2000 года ў аддзеле праводзяцца выпрабаванні на наяўнасць лятучых хімічных рэчываў, што вылучаюцца пры эксплуатацыі мэблі ў паветра жылых памяшканняў. Па ініцыятыве кіраўніцтва ЦСМС і пры падтрымцы Дзяржстандарту з прыцягненнем беларускай навукі ў кароткія тэрміны распрацаваны і прайшлі метралагічнае пацвярджэнне прыдатнасці методыкі па вызначэнні хімічных рэчываў (за выключэннем методык па вызначэнні наяўнасці фармальдэгіду, бо існуе ДАСТ 30255).

У 2007 годзе асвоены выпрабаванні па вызначэнні паказчыка ўзгаральнасці элементаў мяккай мэблі ад тлеючай цыгарэты і полымя газавай гарэлкі. Годам раней — выпрабаванні па вызначэнні ўзроўню напружанасці электрастатычнага поля на паверхні мэблі. Аддзел таксама мае тэхнічную магчымасць для правядзення выпрабаванняў на адпаведнасць еўрапейскім і (ці) міжнародным нормам (EN, ISO) фанеры, ДВП і ДСП, у тым ліку па паказчыках трываласці, на вільгацеўстойлівасць, даўгавечнасць, наяўнасць фармальдэгіду. Планава вядзецца дааснашчэнне аддзела дадатковым абсталяваннем.

На вялікі жаль, у краіне адсутнічае тэхнічная база для павышэння кваліфікацыі спецыялістаў па выпрабаваннях мэблі і правядзенні міжлабараторных параўнанняў у гэтай галіне.

Са стварэннем Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, з мэтай спрашчэння, у прыватнасці, прасоўвання тавару на ўнутраныя рынкі краін-удзельніц, узнікла неабходнасць у распрацоўцы, прыняцці і ўкараненні агульных тэхнічных нарматыўных прававых актаў тэхнічнага рэгулявання. Адносна мэблі Рашэннем Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі ад 15.06.2012 г. за № 32 прыняты тэхнічны рэгламент ТР МС 025/2012 «Аб бяспечнасці мэблевай прадукцыі». Вызначаны тэрмін увядзення яго ў дзеянне — 1 ліпеня 2014 года. Патрабаванні гэтага дакумента

Начальнік аддзела даследаванняў харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі Ірына ЛАЗАВАЯ і інжынер-хімік Таццяна ЛАГУН.



Вядучы інжынер-хімік Галіна ЗАГАРЭЙ вызначае прысутнасць воцатнай кіслаты ў прадуктах.

З установкай для аўтаматызаваных выпрабаванняў матрацаў на трываласць нас пазнаёміў намеснік начальніка аддзела выпрабаванняў мэблі і вырабаў дрэваапрацоўкі Васіль БАРУШКА.

Начальнік аддзела тэхабслугоўвання і рамонту сродкаў вымярэнняў Сяргей КРАМНІК (першы справа) з інжынерамі Сяргеем ЖУКАЎЦОМ і Вячаславам СУБОТАЙ.

абавязковыя і распаўсюджваюцца на мэблевую прадукцыю, што выпускаецца ў абарачэнне на адзінай тэрыторыі Мытнага саюза — вырабы, наборы, гарнітуры мэблі бытавой і для грамадскіх памяшканняў, у тым ліку на вырабленую па індывідуальных заказах.

— Зараз, у пару высокіх тэхналогій, на слыху каліброўка, якой таксама займаецца ваш цэнтр. А без паверкі наогул не абысціся...

— Аддзел паверкі і каліброўкі сродкаў вымярэння сёння налічвае больш за 20 супрацоўнікаў і «ўзброены» 200-мі рабочымі нацыянальнымі эталонамі. Дзяржаўныя паверыцелі ажыццяўляюць паверку больш як 130 тыпаў сродкаў вымярэнняў, выконваюць каліброўку розных тыпаў сродкаў вымярэнняў, у тым ліку тых, што не ўнесены ў дзяржаўны рэестр Рэспублікі Беларусь і не прайшлі дзяржаўную паверку. А таксама атэстацыю і каліброўку выпрабавальнага абсталявання, распрацоўку методык выканання вымярэнняў. Тут у нас таксама ёсць свая «фішка». Мы адзіныя ў рэспубліцы праводзім паверку арэометраў усіх відаў. А ўвогуле аддзел ажыццяўляе паверку (каліброўку) сродкаў вымярэння: ціску і вакууму, параметраў руху, электрычных велічынь, фізіка-хімічных і оптыка-фізічных велічынь, радыётэхнічных велічынь, сродкаў тэхнічнай дыягностыкі, інфармацыйна-вымяральных і кіруючых сістэм і гэтак далей.

Тым не менш, існуюць пэўныя вытворчыя праблемы. Не ўсе прадпрыемствы, асабліва сельгасперапрацоўшчыкі, выконваюць патрабаванні заканадаўства аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў у плане паверкі сродкаў вымярэнняў. У нас за многія гады напрацаваны рэестр іх вымяральнай тэхнікі, і мы сочым, а ў выпадку неабходнасці ўздзейнічаем праз органы дзяржаўнага кіраўніцтва на месцах.

Каліброўка з'яўляецца дастаткова новым і эфектыўным метадам метралагічнага кантролю. Таму, каб быць на вышыні, таксама набываем сучаснае каліброўчнае абсталяванне. Тэхнічныя навыкі ўдасканальваем не толькі на курсах павышэння кваліфікацыі, але і на трэнінгах у БГЦА і БелГІМе з удзелам еўрапейскіх экспертаў і пры выкананні міжлабараторных параўнанняў, якія праводзіць нацыянальны правайдар.

Лацінскія карані якасці

— Мы сёння знаёмім шырокага чытача з магчымасцямі цэнтра. Давайце зазначым, што адзін з вашых любімых «канькоў», на якім цэнтр адчувае сябе цалкам упэўнена, — сертыфікацыя.

— Орган па сертыфікацыі быў створаны ў свой час таму, што гэта запатрабавала жыццё. Спецыялісты аддзела праводзяць работу па пацвярджэнні адпаведнасці, у тым ліку ў рамках заканадаўства Мытнага саюза, па харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі, мэблі і вырабах дрэваапрацоўкі, прадукцыі лёгкай прамысловасці, сродкаў індывідуальнай засцярогі, прадукцыі, неабходнай пры ўзвядзенні будынкаў і збудаванняў, праектнай дакументацыі. Таксама па сертыфікацыі работ у галіне будаўніцтва, па абслугоўванні транспартных сродкаў і іншых у адпаведнасці з вобласцю акрэдытацыі. Летась вобласць акрэдытацыі значна пашырана, з чым можна пазнаёміцца на сайце ЦСМС (**www.slutskcsms.by**).

Слова «сертыфікацыя» ў перакладзе з лацінскай азначае «зроблена правільна». Каб пераканацца, што той ці іншы прадукт «зроблены правільна», важна ведаць, якім патрабаванням ён павінен адпавядаць і якім чынам можна атрымаць дакладныя доказы гэтай адпаведнасці. У аддзеле назапашаны вялікі вопыт у галіне пацвярджэння адпаведнасці, працуюць высококваліфікаваныя спецыялісты, эксперты-аўдытары. Яны праводзяць работы па сертыфікацыі не толькі ў Беларусі, але і ў краінах блізкага і далёкага замежжа.

— Сёння ўсе разумеюць, што якасць прадукцыі — гэта высокі імідж яе вытворцы сярод спажыўцоў, магчымасць выхаду не толькі на ўнутраны, але і на знешні рынкі. І пры пастаўках прадукцыі ў краіны СНД і ЕС неабходнай умовай часта з'яўляецца наяўнасць дзеючых эфектыўных сістэм якасці...

— Таму орган па сертыфікацыі РУП «Слуцкі ЦСМС» і праводзіць работы па сертыфікацыі сістэм менеджменту якасці на адпаведнасць СТБ ISO 9001, а таксама сістэм кіравання аховай працы на адпаведнасць СТБ 18001, сістэм НАССР на адпаведнасць СТБ 1470 і сістэм МБПП на адпаведнасць СТБ 22000. Безумоўна, на органе па сертыфікацыі сістэм кіравання вельмі вялікая адказнасць. Спецыялістам аддзела даводзіцца праводзіць напружана, мэтанакіравана, у тым ліку па давядзенні ўстаноўленых Адзіных патрабаванняў Мытнага саюза да суб'ектаў гаспадарання. Праводзяцца семінары, «круглыя сталы», у рэгіянальных газетах размяшчаюцца інфармацыйныя артыкулы. Інфармацыю аб мерапрыемствах можна атрымаць на сайце ЦСМС.

Формы вучобы, у тым ліку і для нашых работнікаў, бываюць розныя. Скажам, мы выконвалі платныя паслугі па сертыфікацыі прадукцыі ў краінах Еўрасаюза — Італіі, Іспаніі, Германіі, Францыі, Польшчы, краінах Прыбалтыкі. Для нашых спецыялістаў гэта быў не толькі прафесійны «найвышэйшы пілатаж», але і напружаная вучоба, калі трэба было «расці над сабой».

Важнасць стварэння ў свой час сістэм кіравання якасцю для рэальнага сектара цяжка пераацаніць. З укараненнем гэтых сістэм на прадпрыемствах зроблена вельмі вялікая справа, яны далі штуршок далейшаму развіццю прамысловага сектара эканомікі, паспрыялі яго тэхнічнаму перааснашчэнню, падрыхтоўцы персаналу.

— Сёння вы гаворыце пра новыя гарызонты ў гэтай рабоце.

— Сістэмы менеджменту ўкараніны і функцыянуюць перш за ўсё на экспартаарыентаваных прадпрыемствах. Гэта было адно з асноўных патрабаванняў замежных партнёраў, яно і сёння дапамагае атрымліваць перамогу ў тэндарах. Але ТР МС 021 па бяспецы харчовай прадукцыі, які ўведзены з 1 ліпеня 2013 года, абавязвае ўкараніць сістэму менеджменту бяспечнасці харчовых прадуктаў на ўсіх прадпрыемствах, незалежна ад формы ўласнасці і кірункаў дзейнасці. Пачатак пакладзены буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі, далей пойдуць усе іншыя, і так — да прадпрыемстваў грамадскага харчавання (кавярняў, рэстаранаў і г.д.). Сістэмнае выкананне ўсіх элементаў, якія існуюць на базе міжнародных стандартаў серыі ISO 9000, і іх падтрыманне на эфектыўным узроўні прынясе любому суб'екту бізнесу вялікую карысць. Лягчэй будзе выходзіць і на новыя гарызонты, вызначаныя еўрапейскімі нормамі і тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза. Работа гэта вялікая, і калі ў спецыялістаў на месцах будуць пытанні, запрашаем звяртацца да нас па дапамогу, бо орган па сертыфікацыі, як і выпрабавальныя падраздзяленні Слуцкага ЦСМС, акрэдытаваныя ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі і ўключаны ў Адзіны пералік органаў і выпрабавальных лабараторый Мытнага саюза.

Вядучы інжынер-хімік Валянціна РАДЗЮКЕВІЧ праводзіць забор проб паветра з кліматычнай камеры для вызначэння шкодных лятучых рэчываў, якія выдзяляюцца з мэблі.

Каб рабіць грунтоўна

— Калі ласка, пойдзем далей. Ваш аддзел рамонту і тэхнічнага абслугоўвання сродкаў вымярэння можна разглядаць як адгалінаванне ад аддзела паверкі?

— Рамонтная служба пачала сваё станаўленне з 1994 года, а ў 2006 годзе створаны аддзел тэхнічнага абслугоўвання і рамонту сродкаў вымярэння. У апошнія гады развілі рамонт усіх сродкаў вымярэння масы — ад медыцынскіх да таварных і аўтамабільных, вагавых дазатараў; ціску (манометры, манавакуумметры) і іншых. Работы выконваем у тым ліку з выездам да заказчыка, бо набылі транспарт і аснасцілі яго спецыяльным абсталяваннем. Перасоўная лабараторыя па рамонце і тэхнічным абслугоўванні дазваляе выконваць работы аўтаномна і мінімізуе затраты заказчыка. За 2013 год адрамантавана каля 18000 адзінак сродкаў вымярэнняў.

Дарэчы, аднымі з першых мы пачалі выконваць і работу па мадэрнізацыі вагаў — як аўтамабільных, так і складскіх. У свой час ЗІЛы з маніпулятарамі сталі першым вопытам у цэнтрах стандартызацыі пры выкананні паверкі і рамонту шматтонных (ад 20 да 60 тон) аўтамабільных вагаў. Мы паспяхова робім гэта з дапамогай спецыялізаваных кампаній, з якімі даўно супрацоўнічаем — яны камплектуюць вагі электронным «начыннем», а ўсю астатнюю работу выконваюць нашы «кіпаўцы». Інжынеры аддзела распрацоўваюць методыкі атэстацыі выпрабавальнага абсталявання.

— Некалькі слоў, Ірына Генадзьеўна, пра яшчэ адзін важны аддзел — вымярэнняў і эканалагічнага нарміравання.

— За апошнія гады значна пашырылася дзейнасць па эканалагічным нарміраванні з распрацоўкай інструкцый, пашпартоў — па вытворчым экалагічным кантролі, абыходжанні з адыходамі вытворчасці; па эксплуатацыі вентыляцыйных установак і сістэм ПГУ; пашпартоў вентыляцыйных установак і сістэм ПГУ; актаў інвентарызацыі выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу; праектаў дапушчальных выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу з выкананнем разлікаў рассейвання выкідаў. Пачалі выконваць і работы па распрацоўцы дакументаў у галіне экалагічнага рэгулявання.

З веданнем справы займаюцца нашы спецыялісты і атэстацыяй рабочых месцаў па ўмовах працы з выдачай адпаведных дакументаў, што вызначаны заканадаўствам рэспублікі. У адпаведнасці з уведзенай у лютым 2014 года новай рэдакцыяй Закона аб ахове працы, мы трапілі ў рэестр Мінпрацы Рэспублікі Беларусь.

Работы ў гэтых кірунках выконваем у розных рэгіёнах рэспублікі. Кожнаму заказчыку патрэбна прапанаваць выканаць неабходную яму работу хутка, абавязкова якасна, і — за памяркоўную цану. Аб'ёмы работ знаходзіць не вельмі лёгка, але гэта заканадаўчае патрабаванне. Наш дадатковы плюс — наяўнасць уласнай выпрабавальнай лабараторыі. У шэрагу абласцей мы замацаваліся дастаткова ўдала і будзем працягваць работу ў гэтым кірунку далей.

Ведаць свае «плюсы»

— Пракаментуйце, калі ласка, ваша стаўленне да экспартнай палітыкі суб'ектаў гаспадарання.

— Мы выходзім з таго, што якасць прадукцыі павінна быць аднолькава высокай і для ўнутранага, і для знешняга рынку. У нашай сумеснай з рэальным сектарам працы няма раздзялення, што вось гэтая прадукцыя пойдзе на ўнутраны, а гэтая — на знешні рынак. Уся прадукцыя павінна адпавядаць пэўным патрабаванням. І прадпрыемствы павінны валодаць поўным пакетам дакументаў на выпуск сваёй прадукцыі. Як інакш? Таму па-ранейшаму актыўна працуем з прадпрыемствамі па данесенні інфармацыі.

Хацелася б звярнуцца да прадпрыемстваў-партнёраў. Сёння на базе стандартаў ISO 9000 створана шмат разнастайных інструментаў эфектыўнага менеджменту. І кабдасягнуць лепшай канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, работа маркетынгавых службаў павінна быць больш сістэмнай. Павінны больш актыўна праводзіцца тыя ж дэгустацыі, конкурсы брэндавай прадукцыі з прызамі для ўдзельнікаў і наведвальнікаў. Не варта абмяжоўвацца толькі ўдзеламі ў абласных і рэспубліканскіх конкурсах, а смела заяўляць пра сябе на расійскіх і тых, што праводзяцца пад эгідай СНД. Больш актыўна прапаноўваць свой прадукт, не саромецца падаваць яго ў выгадным святле, калі ён таго заслугоўвае. Тут усё залежыць ад падрыхтаванасці кадраў, ведання імі рынкаў, шырокага валодання мовамі, гатоўнасці і нават жадання прафесійна працаваць. Магчыма, варта стварацьспецыялізаваныя аддзелы міжнароднага маркетынгу.

Мы ў сябе ў рэгіёне шмат робім, каб зацікавіць вытворцаў працаваць больш якасна і думаць аб перспектыве. Узважыць стан спраў сёння і пралічыць, што патрэбна на недалёкае будучае. Мы валодаем дастаткова багатай нарматыўнай базай. Таму падкрэслім: сайты Дзяржстандарта, Мытнага саюза, тэрытарыяльных ЦСМС гатовы аператыўна забяспечыць суб'екты гаспадарання ўсёй неабходнай актуальнай інфармацыяй.

— Вы ўвесь час успамінаеце пра тэхнічную ўзброенасць. А што з вашай аснашчанасцю зараз?

— Дзякуючы планаваму падыходу цэнтр мае магчымасць дааснашчаць свае лабараторыі новым сучасным абсталяваннем. Скажам, аснашчанасць сучасным абсталяваннем аддзела выпрабаванняў харчовай прадукцыі на сёння амаль стапрацэнтная. Мікрабіялагічнае падраздзяленне цалкам адпавядае еўрапейскім патрабаванням.

І імкнёмся, каб так было па ўсіх службах. Запланавалі на гэты год рэканструкцыю адной з кліматычных камер аддзела па выпрабаваннях мэблі, бо, згодна з еўрапейскім стандартам, узнікаюць крыху іншыя падыходы да пробападрыхтоўкі. З'яўляюцца новыя патрабаванні па бяспецы мэблі ў дакументах Мытнага саюза (адзінаццаць новых).

Набываем сучаснае каліброўчнае абсталяванне. Замест адпрацаваўшага свой рэсурс — і новае паверачнае абсталяванне. Калі аналізуецца наша работа па дасягненні даведзеных аб'ёмаў, выкананні бізнес-планаў, кіраўніцтва галіны заўсёды цікавіцца: на чым будзеце працаваць? Прычым пытанне ставіцца больш шырока: як, наколькі эфектыўна будзеце дапамагаць суб'ектам гаспадарання выконваць задачы, пастаўленыя перад імі ўрадам?

Чалавечы фактар

— І ўсё ж на першы план выходзіць не толькі і не столькі абнаўленне парку абсталявання, пры ўсёй першаступеннай важнасці гэтай работы, а работа з уласным калектывам, — зазначае дырэктар. — Ад яго прафесіяналізму і грамадзянскай актыўнасці залежыць поспех нашай місіі.

Кваліфікацыя супрацоўнікаў цэнтра высокая. І мы імкнёмся ствараць матывацыю для супрацоўнікаў да далейшай высокаэфектыўнай работы, і не толькі пры дапамозе зарплаты, прэмій і надбавак. Падводзяцца вынікі спаборніцтва за квартал. Па выніках работы за год партрэты перадаюцца вывешваюцца на стэндзе «Гонар за працу», а ў аддзелах вызначаюцца лепшыя спецыялісты па кірунках. Прычым пераможца павінен лідзіраваць і ў аб'ёмах выканання работы, і ў асваенні новых паказчыкаў. Засталося такое паняцце, як рацыяналізатарская работа, і ўдзел у ёй заахвочваецца.

У рабоце нам дапамагае тое, што распрацавана і дзейнічае ўласная сістэма менеджменту якасці — яна існуе з 2003 года, сертыфікавана і падтрымліваецца на актуальным узроўні. Ёсць уласная палітыка і мэты ў галіне якасці, і стараемся, каб яны не разыходзіліся з пажаданнямі заказчыкаў. Бо ад гэтага залежыць канкурэнтаздольнасць нашых паслуг.

20 мая мы будзем адзначаць Сусветны дзень метралогіі, а ў чэрвені — Міжнародны дзень акрэдытацыі. Хачу павіншаваць сваіх калег, свой калектыў з прафесійнымі святамі і пажадаць міру, поспехаў у працы, дабрабыту, — сказала ў заключэнне Ірына Якута.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 600154116

Ва ўсе часы дамы рубенсаўскіх формаў лічыліся ўвасабленнем мацярынства і жаноцкасці. Праўда, сённяшнія каноны прыгажосці ствараюць для такіх жанчын шмат праблем, асабліва пры складанні гардэроба. Як правіла, найбольшы выбар адзення ў крамах прадстаўлены ў дыяпазоне 42—48 памеру, а тыя ўборы, што перавышаюць гэты памерны рад, часта выглядаюць бясформенна і мехавата. Тым не менш, выбраць прыгожае і моднае адзенне для поўных можна, і вельмі паспяхова, трэба толькі прыслухацца да парад стылістаў.

✓ Перш за ўсё вам неабходна клапаціцца аб тым, каб адзенне дапамагала захаваць правільнасць прапорцый і гарманічныя суадносіны частак цела. Таму варта крытычна ацаніць сябе і дакладна абазначыць свае праблемныя зоны.

✓ Не купляйце адзенне на памер—два большае, шырокае ці «балахоністае». Не трэба думаць, што яно схавае паўнату. Наадварот, бясформенасць робіць фігуру яшчэ больш масіўнай і аб'ёмнай. Вялікі памер адзення проста абавязвае акцэнтаваць увагу на лініі таліі. Гэта дазваляе зрабіць сілуэт збалансаваным, нават у тым выпадку, калі сама талія далёкая ад запаветных 60 сантыметраў (дарэчы, каб падкрэсліць талію, выкарыстоўвайце тонкія (!) рамяні).

✓ Не верце тым, хто сцвярджае, што набывае адзенне без прымеркі. Так не бывае: нават на манекеншчыц са стандартнымі «90-60-90» кожную сукенку падганяюць. Таму, каб выбраць, трэба прымяраць, прымяраць і яшчэ раз прымяраць.

✓ Выбірайце матэрыялы дастаткова эластычныя, якія свабодна аблягаюць цела. Яны робяць фігуру больш роўнай, згладжваючы яўныя пераходы паміж рознымі часткамі цела. Штаны і спадніцы варта выбіраць з непразрыстых, шчыльных па фактуры тканін. Такія рэчы на поўнай фігуры «сядзяць» практычна ідэальна. Пазбягайце бліскучых, з пералівам тканін, матэрыялаў занадта мяккіх і рэльефных — усе яны маюць уласцівасць візуальна паўніць. Такім жа эфектам валодаюць і тканіны ў шырокую папярочную палоску і буйную клетку. Лепш выкарыстоўвайце вертыкальныя або дыяганальныя палосы, якія, дзякуючы аптычнай ілюзіі, «выцягваюць» ваш сілуэт.

Асобна трэба вылучыць тонкі эластычны трыкатаж: жанчынам «з аб'ёмамі» ён катэгарычна супрацьпаказаны. Асаблівасць гэтага матэрыялу — яго здольнасць падкрэсліваць кожны «валік», кожную складачку на вашым жываце, а часам і спіне.

✓ Даўно вядома, што чорны колер і цёмныя адценні хаваюць недахопы фігуры. Аднак не варта абмяжоўваць сябе занадта моцна: можна смела выбіраць рэчы яркіх, сакавітых і глыбокіх колераў. Што да малюнка на тканіне, то выкарыстоўвайце дробны, нескладаны малюнак з яшчэ радаснымі акцэнтамі (анімалістычны ці кветачны прынт, рознакаляровая палоска).

✓ У гардэробе кожнай «пампушкі» проста абавязана быць якасная бялізна для карэкцыі фігуры. Эластычныя калготкі, штонікі згладзяць лінію таліі і паменшаць клубы ў аб'ёме, «грацыя» прыпадыме грудзі. Адзенне на такой бялізне будзе лепш «сядзець». Галоўнае правіла пры выбары сподняй бялізны — мадэль не павінна нічога пераціскаць.

✓ Ідэальным фасонам сукенкі для «пампушак» можна лічыць суцэльнакроеныя сукенкі з падоўжнымі вертыкальнымі лініямі. Візуальна яны выцягваюць фігуру, адначасова робячы яе больш стройнай. Старайцеся падбіраць фасоны і камбінацыі рэчаў, якія ствараюць гэтыя самыя вертыкальныя лініі. Выдатна падыдуць фасоны з падоўжанымі лініямі, якія сфарміраваны планкамі, бейкамі, кантамі.

Жанчынам з праблемамі ў вобласці жывата і клубоў рэкамендаваны сукенкі з завышанай лініяй таліі.

Пазбягайце бліскучых, з пералівам тканін, матэрыялаў занадта мяккіх і рэльефных — усе яны маюць уласцівасць візуальна паўніць.

Сукенкі-падманкі таксама нібыта створаны для поўных жанчын: цэнтральная частка выраб павінна прыцягваць увагу і быць цямнейшай, чым бакавыя светлыя элементы, якія быццам «растаюцца» ў прасторы. Дзякуючы гэтаму прыёму фігура жанчыны здаецца больш зграбнай.

✓ Дамы з пышнымі формамі чамусьці рэдка носяць спадніцы. І дарэмна!

Для жанчыны з шырокімі клубамі падыдзе спадніца, якая звужаецца ўніз: спадніца-алавак, спадніца-цюльпан. Калі ж да клубоў дадаецца жывоцік, патрэбна крыху зменена варыяцыя «алоўка» — з завышанай таліяй. Жанчынам з вялікімі грудзямі і параўнальна вузкімі клубамі стылісты рэкамендуюць спыніцца на спадніцы-«паўсонца». Добра выглядае на пампушках і спадніца-гадэ. А вось пра «міні», шырокія расклёшаныя спадніцы лепш забыцца. Калі ж вам вельмі захочацца паэксперыментаваць, то можна спыніць выбар на спадніцы з асіметрычным кроем.

Ёсць і тут адно непарушнае правіла: у спадніцы абавязкова павінен быць чахол або падкладка. Гэта маленькая дэталь дапаможа вырабу лепш «сесці», пазбегнуць непатрэбных складак.

Што датычыцца даўжыні, то даўжыня «да падлогі» — гэта не самы лепшы варыянт для пышнацелых дам. Выключэнне можна зрабіць толькі для вячэрніх сукенак. У штодзённым жыцці аддавайце перавагу традыцыйнай даўжыні — да сярэдзіны калена або крыху ніжэй за калена.

✓ Калі гаварыць пра штаны, то ваш выбар — штаны-клёш ад сцягна (клёш сярэдні). Штаны ў абцяжку або шчыльныя легінсы ў спалучэнні з тунікай дапускаюцца, калі вашы ногі ад сярэдзіны сцягна дастаткова стройныя і маюць прывабную форму (дарэчы, туніка гэта не толькі модная рэч у жаночым гардэробе, але яшчэ і спосаб схаваць лішнія кілаграмы).

Удала выглядаюць на поўнай фігуры і штаны прамога крою. Пры гэтым яны павінны аблягаць, але не абцягваць фігуру, а таксама не надта звужацца ў вобласці калена. Выцертыя пасярэдзіне кожнай калашыны джынсы — таксама нядрэнны варыянт. Візуальна гэта дазваляе зрабіць ногі больш стройнымі, факусіруючы ўвагу на сярэдзіне нагі і адводзячы ў цень праблемныя зоны па баках.

Забудзьце пра капры, ультракароткія шорты, джынсы з нізкай пасадкай!

✓ Асаблівую ўвагу звярніце на вобласць дэкальтэ. На дамах з пышным бюстам добра выглядаюць фасоны адзення з запахам, якое ўтварае V-падобны выраз. Круглы выраз, выраз «лодачка» пераважныя для ўладальніц прыгожай шыі і падбародка, а вось каўняра-стойкі, які ўкарочвае шыю, «пампушкам» наогул трэба пазбягаць.

Мноства рушаў, іншыя аб'ёмныя дэкаратыўныя элементы зробяць пышны верх яшчэ больш аб'ёмным. А вось буйны дэкаратыўны элемент, які выступае сола, напрыклад, брошка ў выглядзе кветкі, выдатна падыдзе, паколькі будзе прыцягваць увагу да сябе.

✓ Каб схаваць паўнату рук і візуальна не ўкарочваць іх, рукавы лепш выбіраць даўжынёй да локця або 3/4. Доўгія і празрыстыя рукавы таксама прымальны варыянт.

Пад забаронай рукавы-ліхтарыкі, якія пашыраюць лінію плячэй.

✓ Падчас выбару адзення пазбягайце складак, плісэ, буйных накладных кішэняў, рушаў і валанаў, шырокіх паясоў. Такія ўпрыгажэнні могуць згуляць злы жарт з вашым абліччам, надаўшы пышным формам непатрэбны дадатковы аб'ём. Аксесуары таксама не павінны быць масіўнымі. Пацеркі ў адну доўгую нітку, маленькі шалік на шыі, тонкія бранзалеты, невялікая сумка на плячы нададуць вашаму вобразу асаблівую вытанчанасць і лёгкасць. Забудзьце і пра разнастайныя хусткі на плячах, паланціны і шалі — наўрад ці яны зробяць вас больш стройнымі. А вось элегантны негрузасткі абцас «выцягне» ваш сілуэт. Падняўшы сябе на некалькі сантыметраў і ўлічыўшы ўсе нюансы, вы ператворыцеся ў пышнагрудую красуню з выразнай таліяй і шыкоўнай лініяй сцёгнаў.

Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ

■

ШТО НАДЗЕЦЬ «ПАМПУШЦЫ»?

Многія пышнацелыя жанчыны саромеюцца сваіх памераў. А дарэмна...

■ Каля люстэрка

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение

«Минскстрой»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв – 13.00–14.00,
тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес.

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 22.04.2014 № 174 «О мерах по завершению строительства жилого дома» объединение осуществляет (завершает) строительство 7-10 секций жилой части объекта «Многоквартирный жилой дом № 10 по генплану по ул. Притыцкого в комплексе с многоярусной автостоянкой» (далее – объект строительства).

Земельные участки общей площадью 1,8982 га предоставлены на основании решения Мингорисполкома от 20.02.2014 № 398 «Об изъятии, предоставлении земельных участков».

Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Жилой дом запроектирован 16-этажным, имеет техническое подполье и теплый чердак. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – декабрь 2014 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 25.05.2007 № 1198-5/07 (с дополнением от 26.03.2014 № 145-15/14).

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир №№ 285, 286, 290, 330, 340, 357, 361, 362, 363, 364, 365, 366, 368, 379, 384, 385, 390, 391, 397, 402, 403, 408, 414, 415, 420, 421, 422, 423, 428, 433, 436, 440, 444, 452, 456, 457, 458, 459, 460.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

1-комнатные квартиры – 1 700 долларов США,
2-комнатные квартиры – 1 650 долларов США,
3-комнатные квартиры – 1 600 долларов США.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Договор строительного подряда от 17.02.2014 № 43/26-2014, генподрядчик – ОАО «Строительный трест №4».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Генеральный директор *Н.В. Милошевский*

УНП 690019195

К сведению акционеров
ОАО «Современные розничные технологии».
Предложение о выкупе (покупке) акций:
ТЕКСТ ПРЕДЛОЖЕНИЯ ЭМИТЕНТА О ВЫКУПЕ АКЦИЙ ПО ТРЕБОВАНИЮ АКЦИОНЕРОВ

Полное наименование и место нахождения эмитента-покупателя акций	Открытое акционерное общество «Современные розничные технологии», Минский район, Хатежинский с/с, 1, административно-бытовой корпус, каб. 106
Количество акций, которое эмитент-покупатель намеревается приобретать	20 000 шт. акций (общая сумма денежных средств, направляемых Обществом на выкуп акций по требованию его акционеров, не может превышать десяти процентов стоимости чистых активов акционерного общества на дату принятия настоящего решения, определяется на основании данных бухгалтерского учета);
Общее количество размещенных (не принадлежащих эмитенту) акций	3 425 892 шт.
Цена приобретения акций	35 926 рублей
Цель приобретения акций	Аннулирование
Вид, категория приобретаемых акций	Простые (обыкновенные) акции.
Место совершения сделок	Минский район, Хатежинский с/с, 1, административно-бытовой корпус, каб.106 (внебиржевые сделки)
Сроки (даты начала и окончания покупки акций), форма и порядок оплаты акций	Подача акционерами заявлений с требованием о приобретении Обществом акций, прием заявлений осуществляется в период: с 16.05.2014 по 25.05.2014 (включительно). Заключение договоров купли-продажи акций и оплата стоимости акций осуществляется в период: 26.06.2014 года по 04.06.2014 (включительно). Акции оплачиваются денежными средствами: безналичный (перевод на счета акционеров) и/или наличный (выплата из кассы организации) расчет. Расходы, связанные с оформлением и исполнением договора, несет акционер.

Настоящее предложение может быть отозвано в случае не представления в установленный срок ни одного требования (предложения) акционеров о выкупе акций.

И З В Е Щ Е Н И Е

Государственное производственное объединение

«Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану» в г. Минске, ***опубликованную в газете «Звязда» 7 декабря 2012 года:***

Ожидаемый ввод нежилого помещения общественно-бытового назначения № 2 в эксплуатацию – 1 июля 2014 года.

Генеральный директор Н.В. Милошевский

УНП 100071325

И З В Е Щ Е Н И Е

Государственное производственное объединение

«Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная горка-3» (жилой дом), ***опубликованную в газете «Звязда» от 10 мая 2013 года № 85 (27450):***

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений №№ 54, 56, 58, 66, 69, 75, 78, 84, 94, 104, 114, 118, 124, 125, 129, 134, 136, 149, 154, 159, 164, 174, 175, 179, 184, 185, 189, 194, 195, 198, 199, 205, 209, 215, 219, 226, 229, 239, 245, 248, 249 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 3-комнатные квартиры – 1300 долларов США, 2-комнатные квартиры – 1400 долларов США, 1-комнатные квартиры – 1350 долларов США.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 1-комнатных квартир №№ 47, 53, 57, 77, 107 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: – 1450 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Генеральный директор *Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса
«Маладосць»

ЁСЦЬ ПЫТАННІ...

Я пачынаю гэты запіс, седзячы за сталом у сваёй кухні красавіцкім вечарам 2014-га ад Нараджэння Хрыстовага (лічу патрэбным удакладніць, што душа мая па прыродзе сваёй хрысціянка — менавіта таму ёй не вельмі даспадобы муштраваць сябе і цела праглядам тэлевізара, а куды цікавей рабіць справу, хай сабе і такую вось «крамзолістую»). Сяджу, значыць, у кухні, на канапе, якая па міласці гаспадара майго колькі часу яшчэ будзе заставацца цалкам у маім распараджэнні. А ўсё дзякуючы блешням, якія тэрмінова (рыбалка ж на носе!) запатрабавалі рэвізіі — і каб яе, рэвізію, правесці, трэба тыя самыя «колькі часу» аддаць (канапе здрадзіўшы) іх высокасці антрэсолям. Ён, гаспадар мой, завіс на табурэце перад сваімі палічкамі, а ў мяне за спінай — свае: з гаршчочкамі-гарлачыкамі, плеценымі кошыкамі, драўлянымі лыжкамі і розным на тое падобным. Наш сусед знізу (жывём мы на шостым паверсе) казаў неяк, што ў нашай кухні — як у тых Дудутках. У якіх «тых» — мы не ўдакладнялі: вядома ж, Дудуткі ў нас адны на ўсіх. Але напішу вось тут зараз, што ў нас мо і лепей, чым у тых Дудутках. Бо ўсё, па-першае, сваё, спадчыннае, а па-другое, жывое — на службе штодня. Акрамя, што праўда, вілак. Яны прычэплены пад паліцамі, а не стаяць ля «печы», але гэта з той толькі прычыны, што я не выцягваю з іх дапамогай з духоўкі чыгункі (ну, неяк не прыстасавалася). Але гэтыя вілкі маюць пэўную місію! Яны трымаюць на сваёй драўлянай назе... Чаго толькі не трымаюць! Гліняныя медальёны з тых самых Дудутак губляюцца на іх між іншымі — з Нясвіжа, з Гародні, з Заслаўя, з Гальшан... Дзе былі — паўсюль набывалі.

Дарэчы, слухала неяк, тут якраз, у кухні, навіны. Маўляў, аграсядзіб у нас становіцца ўсё больш. І гэта, маўляў, надта ж добра. Яно, напэўна, так і ёсць, бо дзе гарадскому чалавеку прытуліцца, каб адчуць карані — калі не асабістыя, дык хаця б генетычныя? Але! Тут, як той казаў, ёсць адно «але». Прытым, што ўзрастае цікавасць да такога кшталту побыту — шляхецкага ці сялянскага, цікавасць да ўласна вёскі — жывой, аўтэнтычнай — ані не ўзрастае. І нават на плыву не трымаецца. Вось штучна створанае — захапляе, а пракаветна сапраўднае — не. Парадокс парадоксаў.

— Што ты пра ўсё гэта думаеш? — пытаю Яго, пана-гаспадара, які за час маіх разважанняў паспеў і блешні перабраць, і гаспадарку сваю — малюскаў ды крэветак — пералічыць, пакарміць, дагледзець.

— А дзе ты цяпер вёску бачыла? — адказвае мне Ён пытаннем на пытанне. Галава! Не раўня шыі.

І праўда: дзе?

Ледзь не кожны выхадны туды накіроўваючыся, ніколі, дальбог, не трапляю. Бо чым сённяшняя вёска адрозніваецца ад пасёлкаў, складзеных з катэджаў і прыватных дамкоў, што раскіданы па ўскрайках майго мегаполіса? Дзе сёння ранкам галосіць певень? Хіба што дзе-нідзе (так і хочацца першае паўслоўка з гэтых двух да злучка прывязаць, бо адваліцца). Дзе чуваць, як цурчыць малако ў даёнку? Няма ўжо такога паняцця — даёнка. Дзе бабкі на лаўках? — лавак няма. Няма, скажу я вам, нават катоў прыстойных. Каб сядзелі, вяршкоў налізаўшыся, на печы, скручваліся ў «шапку» на мароз і расцягваліся ўздоўж канапы на добрае надвор'е, каб мыліся як след перад прыходам госця і вуркаталі ад задавальнення. Няма катоў — адны «мадэлі» для выставак. Бо кату, каб катом звацца, патрэбны печ, вяршкі і мыш пад венікам замест шчоткі ад пыласоса.

Нешта перакулілася ў гэтым свеце. Але што, які збан дакладна не вытрываў канкурэнцыі з трохлітровікам, — не ведаю.

Напэўна, усё ж такі цудоўна, што аграсядзіб у нас стала больш. Але тут — свая тэма: адпаведнасць формы зместу і зместу месцу. Дакладней, не зусім адпаведнасць або нават зусім не адпаведнасць — а яе, адпаведнасці, поўная адсутнасць. Ну які мне, каб хто сказаў, сэнс збірацца на выхадныя ў «Фальварак Тызенгаўза», калі Тызенгаўза я там не пабачу?

А хацелася б — ёсць пытанні...

■

■ Матуліны занатоўкі

ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ

Ну вось, і з намі такое адбылося...

— Антон, у садок спознімся! — прыспешваю я малога.

— Не, мама, давай лепш прыдумаем іншую ідэю...

Безумоўна, і ў кніжках, і ў інтэрнэце я не раз чытала пра тое, што дзіця з часам можа адмовіцца хадзіць у садок, нават калі адразу ніякіх праблем з наведваннем гэтай установы не ўзнікала. Але чамусьці была ўпэўнена, што нас падобнае абміне. Дык самаўпэўненасць рэдка застаецца без пакарання...

Насамрэч праблема ў нас была зусім не ў садку. Дакладней, не зусім у садку. Напярэдадні Антонаў бацька зноў з'ехаў у сваю працяглую камандзіроўку. І сын, ужо ведаючы, што тату ён пабачыць няхутка (звычайна гэта месяцы праз тры-чатыры), як толькі мог, пачаў выказваць пратэст. Адмаўляцца спаць, есці, гуляць, апранацца, чысціць зубы... А цяпер яшчэ і наведваць садок.

У сына, мяркуючы па ўсім, пачаўся славуты «крызіс трох гадоў». Размаўляць па-людску ён амаль перастаў, на ўсе выпадкі пакінуўшы сабе ўсяго тры фразы.

Мужавы камандзіроўкі дагэтуль заставаліся праблемай, знайсці вырашэнне якой я ніяк не магу. Ні маляванне календароў пад дэвізам «чакаем тату», ні штодзённыя сюрпрызікі, якія муж быццам перадае для Антона разам з пілотамі самалётаў і капітанамі караблёў, ні іншыя мае прыдумкі — нічога не працуе. Сыну проста дрэнна. Па-сапраўднаму, па-даросламу дрэнна. І прызвычаіцца да гэтай, ужо даволі звычайнай сітуацыі ў нашым жыцці, ён ніяк не можа. Але ж у нас крэдыт за кватэру і розныя, пакуль мала яму зразумелыя, дарослыя «абавязацельствы»...

Як правіла, тыдні праз тры сынава жыццё (і маё адпаведна) пачынае наладжвацца. Трэба толькі набрацца цярпення. Але да сітуацыі з садком я ўсё ж не была гатовая.

Да пэўнага моманту Антон там не ствараў праблем нікому. Але калі першы раз зароў, патрабуючы тату, выхавальніца патэлефанавала мне і прапанавала яго забраць. Калі я прыйшла, яна раздражнена ўпікала Антошку: «Сціхні! Не палохай дзяцей!» Сын, на якога ніколі не павышалі голасу, роў яшчэ гучней... І вось цяпер ён катэгарычна не жадае ісці да «злой Кацілаўны» (Кацярыны Мікалаеўны). І няважна, што яна, магчыма, была галодная і не выспалася (так я спрабую патлумачыць Антошку яе незадаволенасць) — дараваць ёй ён не хоча.

«Кацілаўне» я таксама спачуваю. Надвор'е наладзілася, дзеці перасталі хварэць, яна ж — адна, ніякай нянечкі ёй у дапамогу ў нашым садку няма. А ты паспрабуй накарміць і апрануць-распрануць 20 малых адначасова...

Значыць, трэба перацярпець і гэта, вырашыла я. І ў садок мы не пайшлі... Штодня я прапаноўвала сыну распавядаць пра «садзікаўскіх» сяброў і цацкі, з якімі ён там гуляў. Разам з ім згадвала пра дзятлаў і вавёрак, якія жывуць на дрэвах вакол садка, пераглядала мультфільм пра хлопчыка Камарова і кіно пра «вусатага няня»... Калі дакладна, дык усё гэта мы рабілі не ўдваіх, а ўтраіх, разам з лялькай Машай, асобай надзвычай капрызлівай. Вось тут я не цырымонілася, нарэшце дазволіўшы сабе рабіць з лялькай усе тое, што мне хацелася зрабіць з Антонам, калі сілы трываць ягоныя капрызы былі на зыходзе... Гульня сыну вельмі спадабалася. І недзе праз тыдзень «Кацілаўне» было даравана.

А яшчэ праз тыдзень у сына, мяркуючы па ўсім, пачаўся славуты «крызіс трох гадоў». Размаўляць па-людску ён амаль перастаў, на ўсе выпадкі пакінуўшы сабе ўсяго тры фразы.

— Антон, нельга малаціць паравозам па люстэрку, яно можа разбіцца.

— А я хачу!

— На вуліцы лужыны, калі ласка, абуй боцікі.

— Не хачу!

— Давай, я дапамагу табе дастаць гэты самалёт.

— Я сам!

І караскаецца на збудаваную ім піраміду са стала, крэсла і кубіка, каб дацягнуцца да цацачнага самалёта, прычэпленага да жырандолі... Добра, я не перашкаджаю. Толькі на ўсялякі выпадак далёка не адыходжу... Потым паказваю яму шрам на руцэ, які ў мяне застаўся на памяць пра разбітае бабуліна люстэрка (насамрэч гісторыя са шрамам была іншай, але да яе, магчыма, яшчэ дойдзе)... У шкарпэтках Антон нават да ліжэйшай лужыны не дабіраецца, хаця я, прыхапіўшы з сабою невялічкую коўдру, вельмі на гэта разлічвала... Урэшце я пачынаю паводзіць сябе, як Аліса ў Залюстроўі, прапаноўваючы Антошку зусім не тое, што мне ад яго трэба. І ўвесь час мы змагаемся то з драконамі, то з «бамбукамі», якія грунтоўна дапамагаюць сыну (і найперш мне) зрабіць процьму не самых прыемных і не надта вясёлых спраў...

Завітаўшы да нас у госці, мой бацька зазначае:

— У вас тут проста вар'ятня нейкая.

Ды не, вар'ятня — гэта калі дзіця бясконца плача і ные, а ў нас — тэатр!

Цяпер штораніцы сын горда бяжыць у садок, у гэтае цудоўнае месца, куды дарослым уваход забаронены. Маіх сціплых акцёрскіх здольнасцяў хапіла, каб ён выдатна засвоіў, што там — толькі яго тэрыторыя, не мая і не татава... І мне шчыра шкада Танюшку, якую прыводзяць у садок амаль заўжды ў той жа час, калі туды заяўляемся мы з Антонам. «Калі ты будзеш званіць маму, выхавальніца зробіць табе ўкол. А калі будзеш плакаць, па цябе ніхто не прыйдзе», — застрашваюць яе дарослыя кожны раз...

Не памятаю, дзе я гэта прачытала, але есць думка, быццам «крызіс трох гадоў» — рэпетыцыя больш сур'ёзнага падлеткавага крызісу. Маўляў, наколькі ўдала бацькі здолеюць паразумецца з малечай, якая ўпершыню ўсведамляе сваю самастойнасць, настолькі ж гладка (ці нягладка) будуць складвацца пазнейшыя адносіны з іх «калючым» падлеткам. Не ведаю, як і што будзе складвацца ў нас надалей, але падсцяліць саломкі загадзя я не супраць.

Дарэчы, яшчэ раз пра кніжкі. Імкнучыся захаваць сваё і сынава псіхічнае здароўе (сваё — у першую чаргу), рознай педагагічнай літаратуры і інтэрнэт-форумаў з калектыўным досведам я праглядаю сапраўды шмат і пастаянна. Дык вось, самае разумнае і дзейснае, што траплялася мне дагэтуль у сучасных замежных аўтараў і так званай «сусветнай павуціне», ёсць у кніжках аднаго не надта сучаснага і не надта замежнага аўтара. Я пра Антона Макаранку, парады якога, здаецца, узялі на ўзбраенне самыя папулярныя сучасныя псіхолагі...

Марына БЕРАЗЕНСКАЯ

■

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Замор'е

Як можна зарабіць на камарах або жабах

У свеце існуе мноства яркіх маштабных падзей — фестываляў, шэсцяў, карнавалаў — якія даўно ўжо з'яўляюцца «цікавінкай» і нават турыстычнай візітоўкай той ці іншай краіны. Гаворым пра піўное свята Oktoberfest — маем на ўвазе Германію. Радзіма фестывалю Тамаціна і традыцыйных гонак быкоў — Італія і Іспанія, Дзень сурка — традыцыя ЗША, Холі — веснавое свята фарбаў у Індыі, і г.д. Некаторыя забавы зрабіліся інтэрнацыянальнымі і штогод ставяць усё новыя рэкорды па масавасці — напрыклад, масавыя забегі дзяўчат на абцасах і шпурлянне мабільных тэлефонаў.

Акрамя растыражыраваных і папулярных, ёсць шэраг малавядомых, але не менш арыгінальных шоу і спаборніцтваў «у адным флаконе». Прычым у пагоні за відовішчам галоўнымі дзеючымі асобамі ў некаторых з іх выступаюць як людзі, так і разнастайныя жывёліны. Апошняе, дарэчы, выклікае абурэнне ў «зялёных», але толькі дадае грамадскай цікавасці да гэтых падзей. Мы сабралі падборку, бадай, самых незвычайных масавых мерапрыемстваў, наконт якіх цяжка вызначыць, ці гэта спорт, ці масавая забава, ці наогул здзек з удзельнікаў.

НЯСІ МЯНЕ, МУЖАНЁК!

Жонка — выдатны снарад для падтрымання сябе ў форме. Гэтая простая думка прыйшла ў галаву фінскім «робінгудам»

яшчэ ў 1800 годзе. Верхаводы шаек імкнуліся павысіць баяздольнасць сваіх хлопцаў. У якасці своеасаблівага тэсту на фізпадрыхтоўку многія выбіралі выкраданне дзяўчат або мяшка збожжа. З гадамі з крымінальных колаў гэты занятак перамясціўся ў свет спорту. Чэмпіянат планеты па пераносцы жонак з 1992 года праходзіць штогод у фінскім горадзе Сонкаярві. Жонка ўсаджваецца мужу на шыю, а той моцна трымае яе за ногі: бегчы трэба будзе 253,5 метра з перашкодамі з вады, пяску, травы і асфальту. Губляць жонку непажадана: нават калі яна не атрымае траўму, 15 штрафных секунд дакладна налічаць. Жонкі павінны быць не маладзейшыя за 17 гадоў і не лягчэйшыя за 49 кілаграмаў. Асабліва стройным даводзіцца выкарыстоўваць уцяжарвальнік. Акрамя адзіночных спаборніцтваў, прызы разыгрываюцца ў камандным заліку, дзе трое мужчын нясуць адну жанчыну па чарзе, а таксама ў трыятлоне: трэба ўсцягнуць даму на пагорак, пракаціць яе на горным веласіпедзе без багажніка і прабегчы традыцыйную дыстанцыю.

ТРЭНІРОЎКА ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Спаборніцтвы па знішчэнні насякомых-крывасмокаў праходзяць у Італіі штогод. Так, у мястэчку Сан-Надзара-Сезія ўдзельнікам выдаюцца мухабойкі зацверджанага суддзямі дызайну і прадстаўляецца 10 хвілін на «забойствы». Галоўнае — не забываць захоўваць забітых насякомых, бо менавіта па іх і будзе вызначаны пераможца. Трое лепшых «спартсменаў» атрымліваюць па 10 еўра за кожнага знішчанага камара. Зрэшты, правілы могуць вар'іравацца. Падобныя спаборніцтвы былі арганізаваны і на поўдні ад Мілана, але там удзельнікі павінны былі давіць крывасмокаў голымі рукамі. Ад італьянцаў не адстаюць і фіны. Ужо ў іх сярод азёр і балот гэтых насякомых дастаткова! У Лапландыі праводзіцца турнір па знішчэнні камароў на ўласнай спіне.

А пра бег за сырнай галоўкай, скачкі ў грязь і гонкі смаўжоў — наступным разам.

Іван КУПАРВАС.



■ Песню бярыце з сабой

БРАТОК-СУСЕД

Песня «Браток-сусед» Кастуся Цыбульскага і Міколы Яцкова нарадзілася на памежжы тысячагоддзяў. Прачулым словам і бяседнай мелодыяй аўтары жадалі ў гэты псіхалагічна напружаны перыяд нагадаць сваім сучаснікам і нашчадкам пра галоўны запавет людскога існавання — жыць у міры і згодзе. Бо ў супольнай дзейнасці толькі ЛАД і ПАРАЗУМЕННЕ між людзьмі робяць зямлю святой, а іх жыццё прыгожым, стваральным.

І назва вакальнага твора пазначае істотнае ў жыццёвых стасунках. Суседзі мусяць па-брацку ладзіць, дбаць пра ўзаемную добразычлівасць. Розныя абставіны разносяць родзічаў па белым свеце, а сусед пастаянна побач. І вельмі часта патрабуецца яго цёплае слова, своечасовая дапамога, парада... А ўзніклыя пытанні ў суседзяў лёгка вырашаюцца за бяседным сталом. Тут і агністы келіх, і песня-выказванне, і сяброўская заўвага мірна суседнічаюць, няспешна, вельмі далікатна прыносяць прасвятленне.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Верш Кастуся Цыбульскага
Музыка Міколы Яцкова

Я жыву, як усе,
на сяброў багаты,
Ды чамусьці сусед
не ідзе ў хату.
Сам пайду да яго і зірну ў вочы:
Ці крыўдуеш чаго?
Ці прызнання хочаш?

Прыпеў:
Гэй, сусед, стаў на стол,
Што ў хаце маеш,
Калі любіш мяне,
Калі паважаеш!

Гэй, сусед, будзь здароў!
Хай жыве спакуса,
Выпіць, брат, за сяброў
Ды за беларусаў!
Вып'ем, брат, за сяброў
Ды за беларусаў!

Я жыву, як усе,
не збіраю грошы,
І ў госці заву я сяброў харошых.
Завіруць да цямна
з песнямі бяседа,
Ды чамусьці няма
на куце суседа.

Прыпеў.

Я жыву — не тужу,
хата на пагорку,
А суседу скажу
мудрай пагаворкай:
Калі госцю не рад —
не патрэбна перца,
як аукнецца, брат,
так і адгукнецца.

Прыпеў.



НАРОДЖАНЫЯ 17 мая

Для іх характэрны фундаментальны падыход да жыцця. Яны імкнуцца даць усяму простае, але дастаткова глыбокае тлумачэнне. Асаблівай тактоўнасцю яны не адрозніваюцца, заўсёды гавораць тое, што думаюць. Гордыя асобы, рэдка звяртаюцца па дапамогу, ва ўсіх справах і пачынаннях дзейнічаюць асобна. Тым не менш, яны з задавальненнем прымаюць маральную падтрымку з боку родных і сяброў. Прысвяціўшы сябе той ці іншай справе, яны імкнуцца ўрэшце давесці яе да лагічнага заканчэння. Галоўнае для іх — навучыцца прымаць жыццё такім, якое яно ёсць, дазваляць сабе адпачываць і навучыцца быць шчаслівымі.

У аснову іх паводзін пакладзена жаданне ўдасканальваць грамадства. Яны любяць, каб любая справа была выканана ў тэрмін, без мітусні. У сям'і яны адрозніваюцца своеасаблівым голасам розуму, аднак як бацькам ім неабходна адмовіцца ад дыктатарскіх рыс. Абцяжараныя адказнасцю за даручаную справу, яны забываюць пра сябе і свае патрэбы, што становіцца прычынай іх нешчаслівага асабістага жыцця. Каштоўную дапамогу ім могуць аказаць родныя і сябры.

НАРОДЖАНЫЯ 18 мая

Даты Падзеі Людзі

1906 год — у Пецярбургу па ініцыятыве выкладчыка Пецярбургскага ўніверсітэта Браніслава Іванавіча Эпімах-Шыпілы заснавана першае легальнае беларускае выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца». Існавала ў 1906–1914 гг. Створана на кааператыўных пачатках групай перадавой беларускай інтэлігенцыі. Таварыства ставіла перад сабой асветніцкія задачы. Нягледзячы на цяжкае фінансавае становішча, адсутнасць паліграфічнай базы, цэнзурныя рэпрэсіі, выдала лацінкай і кірыліцай 38 найменняў кніг агульным тыражом больш за 100 тысяч экзэмпляраў. Сярод іх — першыя падручнікі на сучаснай беларускай мове: «Беларускі лемантар, або Першае чытанне для дзетак беларусаў» К. Каганца, «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, творы Я. Купалы і Я. Коласа, мастацкую літаратуру, паштоўкі. У 1907–1909 гг. наладзіла выданне падпіснай серыі «Беларускія песняры», у якую ўвайшлі творы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», «Вечарніцы», «Шчароўскія дажынкі», Ф. Багушэвіча «Дудка беларуская», «Смык беларускі», пераклад паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Каб папоўніць рэпертуар беларускіх музычных драматычных гурткоў, таварыства выдавала паліграфічным спосабам п'есы Я. Купалы, А. Чэхава, Э. Ажэшкі. Выдавала альманах «Маладая Беларусь». Выпускала таксама навукова-папулярныя і публіцыстычныя брашуры, паштоўкі з краявідамі Беларусі і партрэтамі беларускіх пісьменнікаў.

1921 год — у Савецкай Расіі быў адменены дэкрэт аб нацыяналізацыі дробных прадпрыемстваў. Пачалася так званая новая эканамічная палітыка — НЭП, абвешчаная на X з'ездзе партыі двума месяцамі раней. «Чырвонагвардзейская атака на капітал», ажыццёўленая бальшавікамі ў рамках палітыкі ваеннага камунізму, прывяла да паралічу эканомікі, і Ленін вымушаны быў пайсці на ўступ класаваму ворагу. З мая 1921 года дазвалялася мець невялікія прыватныя прадпрыемствы. З гэтага часу ва ўжытак увайшло слова «нэпман». Ідэю дэнацыяналізацыі бальшавікі запазычылі ў меншавікоў і эсэраў, якія правялі такую працэдуру яшчэ ўлетку 1918 года ў Паволжы. Нэпманы склалі даволі значную праслойку насельніцтва: па выніках перапісу 1926 года, у адной толькі Сібіры іх было амаль 120 тысяч чалавек. Новыя прадпрымальнікі фармальна дзяліліся на дзве катэгорыі: з гадавым прыбыткам звыш дзесяці тысяч рублёў і ад дзвюх да дзесяці тысяч. Пры гэтым нэпманаў-«акул», што рызыкавалі легальна заводзіць адносна буйны бізнес, было няшмат. Куды больш шматлікай была трэцяя катэгорыя нэпманаў, якія не мелі справы з дзяржавай і развівалі ценявую эканоміку. У канцы 1920-х гадоў сталінскае кіраўніцтва згарнула НЭП, але большасць дзяльцоў, маючы нядрэнныя сувязі ў органах, уладкавалася на працу прадаўцамі, таваразнаўцамі, агентамі па забеспячэнні, а то і кіраўнікамі рознага ўзроўню.

1954 год — 60 гадоў таму нарадзіўся (г. Мінск) Ігар Вячаслававіч Марозаў, беларускі архітэктар, педагог, доктар культуралогіі (1998), кандыдат архітэктуры (1985), прафесар (2001). Працуе ў галіне манументальнага мастацтва: помнікі Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, М. Танку ў вёсцы Пількаўшчына Мядзельскага раёна, князю Барысу ў горадзе Барысаў. Аўтар навуковых прац па праблемах тэорыі і філасофіі дойлідства, герменеўтыцы культуры. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998).

Организация ЗАКУПИТ в больших объемах ОХЛАЖДЕННУЮ, ЗАМОРОЖЕННУЮ СВИНИНУ ДОРОГО. у ИП и юр.лиц по безналичному расчету ООО "Евроторг" УНП 101168731 8 (044) 7888 503

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні вы можаце быць асабліва летуценнымі. Але не забывайце пра асцярожнасць, бо мары часам рэалізоўваюцца і да гэтага пажадана быць гатовымі. Падзеі, якія адбудуцца з вамі ў чацвер, дадуць магчымасць зразумець, што любыя псіхалагічныя комплексы пераадольныя, калі ў цяжкую хвіліну звярнуцца да сяброў па дапамогу.

ЦЯЛЕЦ. Падрыхтуйцеся прымаць заслужаныя кампліменты. Калегі будуць усяляк садзейнічаць ажыццяўленню вашых планаў. Першая палова тыдня павінна прынесці пазітыўныя вынікі, звязаныя з працай. У канцы тыдня можа з'явіцца новае захапленне, якое паглыне ўвесь вольны час. Субота спрыяльная для разнастайных авантур.

БЛІЗНЯТЫ. Хутчэй за ўсё, на гэтым тыдні вам давядзецца разбірацца з папярамі і іншымі нуднымі, але неабходнымі рэчамі. У панядзелак вы можаце адчуць нейкую нестабільнасць, але прычына гэтага знойдзецца не адразу. Эмацыянальнае напружанне спадзе толькі ў сераду. Другая палова тыдня акажацца больш спакойнай. Магчымыя карысныя знаёмствы і цікавыя сустрэчы.

РАК. Ваша занятасць і эмацыянальная напружанасць будзе кідацца ў вочы, таму паспрабуйце пазбягаць лішняй мітусні. Добры тыдзень для распрацоўкі планаў па стварэнні падмурка будучага дабрабыту. Новыя дзелавыя знаёмствы могуць перарасці ў моцныя сувязі. Засяродзьцеся на галоўных клопатах і праблемах і старайцеся не загразнуць у дробязях. Цяпер вам па сілах завяршыць самыя цяжкія і складаныя справы.

ЛЕЎ. Аптымізм у спалучэнні з гнуткасцю ў паводзінах здольны прыцягнуць да вас увагу навакольных. Паспрабуйце не адмаўляць у дапамозе людзям, якія да вас звяртаюцца. Але, здзяйсняючы чарговы подзвіг, не забудзьцеся хоць часам цікавіцца навакольным светам. У зносінах з дзелавымі партнёрамі выкарыстоўвайце такія якасці, як цярпенне, падатлівасць і ўменне рэальна ацэньваць сітуацыю.

ДЗЕВА. Засяродзіцца на працы будзе перашкаджаць пачуццё няўпэўненасці, але на самой справе ў вас больш сіл і ведаў, чым вы думаеце. Пачынаючы з серады, інтуіцыя абвострыцца так, што нават у нязвыклых сітуацыях вы беспамылкова адгадаеце правільную лінію паводзін. У канцы тыдня, падчас усеагульнай мітусні, вашы спачуванне і аптымізм дапамогуць многім. Абавязкова ўзгадніце планы з блізкімі людзьмі.

ШАЛІ. Настройцеся на сур'ёзныя і рашучыя дзеянні, але ўлічыце, што на гэтым тыдні безразважная рызыка можа загубіць усе вашы распачынанні. Калі будзеце рухацца ў правільным кірунку, то і справы пойдуць як па масле, і падтрымка навакольных забяспечана. Да канца тыдня знікнуць практычна ўсе праблемы, а сустрэча з сябрамі ў суботу дапаможа аднавіць мір і спакой у душы.

СКАРПІЁН. У бліжэйшыя дні стан спраў на працы нагляднa прадэманструе ступень вашай прафесійнай прыдатнасці і перспектывы кар'ернага росту. Пажадана не паказваць навакольным сваю нервовасць і раздражняльнасць. З'явіцца магчымасць знайсці ключык да будучыні. У суботу ўзаемаадносіны з навакольнымі могуць вас расчараваць, магчымыя няўдачы ў паездках і кантактах.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень стане найлепшым часам для пераасэнсавання назапашанага вопыту і складання планаў на будучыню з улікам памылак. У дзелавой сферы ўсё будзе, хутчэй за ўсё, не вельмі ўдала, аднак верны сябар дапаможа знайсці выйсце з цяжкага становішча. Магчыма, трэба будзе прыняць адказнае рашэнне і здзейсніць важны ўчынак, але вы лёгка з гэтым справіцеся.

КАЗЯРОГ. Паспрабуйце больш спакойна паставіцца да тых перамен, што адбываюцца ў вашым жыцці. Старайцеся не правакаваць канфліктных сітуацый і адкрытага супрацьстаяння. Своечасова спыніце сябе і не падвяргайце рызыцы, бо ў адваротным выпадку не выключаны сур'ёзныя перамены сітуацыі, прычым не на вашу карысць. Найбольш спрыяльным днём будзе аўторак, няўдалым — чацвер.

ВАДАЛЕЙ. Даволі ўдалы ў эмацыянальным плане тыдзень. Адзіны і найбольш верагодны яго мінус — магчымая паломка нейкай бытавой тэхнікі. Але гэта не выведзе вас з раўнавагі. Чужых парад лепш не слухаць: не выключана, што іх будуць даваць скрытыя нядобразычліўцы.

РЫБЫ. Падагульніць пражытае акажацца нялішнім. Надыходзіць час адкрыць для сябе новую старонку, запаўненне якой варта пачаць з актыўнага засваення атрыманага вопыту. Гэтая інфармацыя складзецца ў новую фармулёўку і адкажа на жыццёва важныя пытанні. Паспрабуйце не дзяліцца самым патаемным: адны могуць не зразумець, а іншыя пазайздросцяць. Калі пачаць раніцу пятніцы ў адпаведным настроі, то яна стане адным з самых выдатных дзён тыдня. Усміхайцеся і ні з кім не сварыцеся. Чым спакайней праведзяце гэты дзень, тым лепш для вас.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Закуска «Палявыя кветкі»

Спатрэбіцца: *хлябцы — 8 шт., сыр плаўлены — 3 шт., сыр цвёрды — 100 г, яйка курынае (вараное) — 2 шт., часнок — 4 зуб., цыбуля рэпчатая — 0,5 шт, шчаўе, шпінат свежы, зеляніна свежая, перац чырвоны малаты, маянэз, смятана, таматны соус, морква — 1 шт., агурок свежы — 1 шт., радыска — 5 шт.*



Пачынаем працэс прыгатавання закускі з надзірання на дробнай тарцы плаўленага сыру (каб сыр добра надзіраўся, пакладзіце яго ў маразільную камеру хвілін на 20). Затым надзіраем любы цвёрды сыр і вараныя яйкі на той жа тарцы. Дадаём дробна нарэзаны часнок. Атрыманую масу дзелім на тры часткі. У першую дадаём маянэз, змешваем. У другую частку дадаём дробна нарэзаную зеляніну, а таксама шчаўе і шпінат. Запраўляем усё гэта смятанай. У трэцюю частку дадаём дробна нашаткаваную рэпчатую цыбулю і чырвоны малаты перац. Запраўляем усё гэта таматным соусам. Бяром хлябцы і дзелім іх на тры роўныя часткі. З сырнай масы лепім шарыкі і ўкладваем іх на хлябцы.

А цяпер пачынаем творчы працэс упрыгожвання. Для гэтага наразаем тонкімі кружочкамі агурок, радыску і моркву і з іх дапамогай робім кветачкі.

Мясныя «сланечнікі»

Спатрэбіцца: *свініна — 300 г, кукуруза кансерваваная — 1 бляшанка, яйка — 1 шт., мука (для прысыпкі), масліны (для ўпрыгожвання), алей раслінны (рафінаваны, для смажання), сыр сметанковы — 2—3 ст. л., часнок і спецыі на смак.*

Свініну нарэзаць невялікімі кавалачкамі, адбіць, пасаліць, дадаць спецыі, апусціць ва ўзбітае яйка, потым у муку, пасмажыць на алеі, даць астыць. У сыр дадаць часнок, прапушчаны праз прэс, намазаць мяса, па крузе раскласці кукурузу. Масліны надзіраем на дробнай тарцы, укладваем у сырэдзінку, падаём з зелянінай.

ПАРАДЫ ДЫЗАЙНЕРА

Як правільна падабраць колер кухоннага гарнітура

Адпраўной кропкай у афармленні інтэр'ера кухні павінна з'яўляцца мэбля. Калі вы плануеце набыць яркую па колеры мэблю, сцены пажадана зрабіць спакойных, нейтральных расфарбовак. І, наадварот, аднатонны і не яркі кухонны гарнітур патрабуе больш кідкіх, кантрасных сцен і дэкору.

У маленькім памяшканні для кухні не трэба выкарыстоўваць цёмныя насычаныя тоны. Памятайце, што светлы колер візуальна павялічвае прастору. А вось памяшканне з вялікай плошчай стане больш утульным, калі светлы гарнітур дапоўніць, «развесці» яркімі акцэнтамі. Занадта цёмны кухонны гарнітур нават у вялікай кухні можа стварыць змрочную атмасферу.

Лічыцца, што для кухоннай мэблі лепш за ўсё падыходзяць колеры прыроды.

- У адным кухонным гарнітуры не варта ўжываць больш за два колеры.
- Калі кухонны гарнітур аформлены двума колерамі, то колер верхніх шафак па танальнасці павінен быць святлейшы за ніжнія.
- Аднатонная кухня лепш выглядае тады, калі яна зроблена ў колерах ад светла-бэжавага да цёмна-карычневага, прыемных, спакойных і не занадта кідкіх адценняў, а памяшканне кухні невялікае.
- Калі гарнітур выконваецца ў розных колерах, дамінантным у гарнітуры павінен быць толькі адзін.
- Розныя колеры кухоннага гарнітура павінны спалучацца адзін з адным. У адным гарнітуры карыстаюцца папулярнасцю наступныя спалучэнні: чорны і белы, чорны і ружовы, чорны і чырвоны, чорны і памяранцавы, чырвоны і шэры, чырвоны і белы, жоўты і сіні, бэжавы і шэры, зялёны і светла-жоўты, цёмна-карычневы і светла-карычневы, карычневы і бэжавы, памяранцавы і цёмна-карычневы, бэзавы/фіялетавы і жоўты, бардовы і светла-ружовы, зялёны і карычневы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.04	21.09	16.05
Віцебск	4.47	21.05	16.18
Магілёў	4.54	20.59	16.05
Гомель	4.58	20.48	15.50
Гродна	5.21	21.23	16.02
Брэст	5.29	21.16	15.47

Месяц

Поўня 14 мая.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Пелагеі, Ісака, Кірылы, Мікіты.*
К. *Веранікі, Веры, Віктара, Славаміра, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+17..+19°С	КІЕЎ	+23..+25°С	РЫГА	+23..+25°С
ВІЛЬНЮС	+22..+24°С	МАСКВА	+24..+26°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+19..+21°С

УСМІХНЕМСЯ

«Калі ў Расіі зноў увядуць пераход на зімовы час, я застрэлюся» (Алег С., мерчандайзер крамы «Свет гадзіннікаў»).

— А не падкажаце, дзе можна нармальна падстрыгчыся?
— Я чуў, у ваенкамаце нядрэнна атрымліваецца.

Люблю вазіць мужа на машыне — крычыць, мацюкаецца, рукамі махае. Эмоцыі цераз край! Затое дома потым сядзіць ціхенька, маўчыць, радуецца, што цэлы вярнуўся!

Прапаршчык на пляцы:
— Радавы Іваненка! Левую нагу падняць, правую руку наперад, крокам марш у яму! Радавы Пятрэнка! Рукі ўбакі, галаву набок, крокам марш у яму!
Гэта заўважае маёр:
— Таварыш прапаршчык! У роце ніякай дысцыпліны, а вы тут у тэтрыс гуляеце!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.746. Індэкс 63850. Зак. № 2003.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 мая 2014 года.